Ксёндз, кветкавод і кухар у адной асобе

Як сельская дэпутатка стала траўніцай

Дровы ачышчальныя, гаючыя і пахучыя

СТАР.2

СТАР.8

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

13 СТУДЗЕНЯ 2016 г. СЕРАДА № 5 (28115) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

КУЛЬТУРА — МЕРА ЧАЛАВЕЧНАСЦІ

Учора адбылася цырымонія ўручэння прэміі Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне», спецыяльных прэмій Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва, спецыяльнай прэміі Прэзідэнта «Беларускі спартыўны Алімп». Выступаючы на ўрачыстым мерапрыемстве, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сказаў:

«Паважаныя сябры!

Адразу хачу адзначыць: сённяшняе ўручэнне прэмій «За духоўнае адраджэнне», а таксама спецыяльных прэмій Прэзідэнта адкрывае цэлы шэраг мерапрыемстваў абвешчанага ў краіне Года культуры. Гэта сведчыць аб тым, што дзяржава надае вялікае значэнне развіццю такой важнай сферы. Галоўная яе задача — актывізаваць інтэлектуальныя, духоўныя сілы нашага народа, падтрымаць ініцыятыву ў мэтах захавання гістарычнай спадчыны, уздыму на новы ўзровень сучаснага мастацтва і выхавання ў грамадзян любові да сваёй Радзімы.

Беларусь багатая на таленты, творчыя дасягненні, якія з'яўляюцца гонарам нашай краіны. Яркім пацвярджэннем гэтага стане шырокае святкаванне юбілеяў нашых выдатных дзеячаў — Уладзіміра Мулявіна, Максіма Багдановіча, Кандрата Крапівы, Івана Шамякіна.

На высокім узроўні мы правядзём 25-ы юбілейны фестываль «Славянскі базар у Віцебску», які стаў той сусветнай пляцоўкай, на якой з поспехам выступаюць прызнаныя майстры і запальваюцца новыя «зоркі».

Увага будзе надавацца не толькі розным напрамкам мастацтва, але і духоўнаму жыццю нашых людзей. Бо мы разумеем, што культура — гэта падмурак, на якім і развіваецца любая нацыя, вызначаюцца яе жыццяздольнасць, творчы патэнцыял. Яна ляжыць у аснове ідэалогіі дзяржаў. Паказвае тыя напрамкі і мэты, на якія павінна арыентавацца грамадства.

Гэта шматгранная з'ява, якая ахоплівае многія сферы жыцця. У тым ліку працоўную дзейнасць, уладкаванне побыту, стаўленне да прыроды, навакольнага свету і роднага краю.

Нельга забываць пра тое, што культура — гэта і мера чалавечнасці. Без яе не могуць быць паўнавартаснымі ні асоба, ні грамадства. Сёння людзі маюць патрэбу ў гуманнасці, міласэрнасці, узаемаразуменні і дабрыні. Без удумлівага, мудрага стаўлення да жыцця, без маральных крытэрыяў, заснаваных на шматвяковым вопыце продкаў, немагчыма пабудаваць стабільную і паспяховую дзяржаву.

Мы жывём у няпросты і, на жаль, вельмі трывожны час. Ужо выбачайце, але я вельмі часта ў апошні час пра гэта кажу. Паверце, нездарма. Найглыбейшы духоўны крызіс ахапіў многія краіны. Як вынік — у розных кутках Зямлі дэструктыўныя сілы робяць спробы зламаць сістэму традыцыйных каштоўнасцяў. Агрэсіўныя нападкі на асновы маралі становяцца адной з злавесных прыкмет сучаснасці.

Высокія тэхналогіі, нябачаная ў гісторыі твараецца ў сродак маніпуляцыі свядомасцю, інструмент распальвання варожасці.

На жаль, ужо відаць горкія плады такой палітыкі. Адхіляюцца інстытут сям'і, каштоўнасць чалавечага жыцця, сацыяльная справядлівасць. Эгацэнтрызм, усёдазволенасць і карысталюбства асуджаюць асобу і грамадства на поўную дэградацыю.

Яшчэ нядаўна здавалася, што свабода дзеля свабоды зробіць усіх нас і ўвогуле ўсё чалавецтва больш шчаслівымі. Але адмова ад маральных самаабмежаванняў прывяла да невырашальных супярэчнасцяў, зацяжных кровапралітных канфліктаў і войнаў. А бяздумнае стаўленне да навакольнага асяроддзя паставіла чалавецтва на грань экалагічнай катастрофы.

Само жыццё дае нам чарговы цяжкі, але важны ўрок. Мы павінны зразумець: тое, што не мае глыбокай маральнай асновы, ні ў якім разе не можа прынесці карысць ні людзям, ні грамадству ў цэлым. Бо яшчэ апостал Павел казаў: «Усё мне можна, але не ўсё на карысць».

Сучасныя рэаліі такія, што менавіта згуртаванасць нацыі вакол сапраўдных, стваральных каштоўнасцяў з'яўляецца гарантыяй яе захавання і прагрэсу, духоўнага здароўя і дабрабыту. Таму невыпадкова на 70-й сесіі Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый наша краіна названа сімвалам міру. Беларускі народ умее здабываць урокі з мінулага, даражыць чыстым небам над галавой і спакоем у грамадстве. Застаецца верным высокім маральным каштоўнасцям і добрым традыцыям.

Важна, каб дзеячы культуры, мастацтва разумелі гэта і сваёй творчасцю супрацьстаялі бескультур'ю і іншым негатыўным з'явам, якія часта азмрочваюць наша жыццё.

Паважаныя лаўрэаты!

Узнагароды за выдатны ўклад у развіццё культуры і мастацтва, за дабрачыннасць і актыўную дзейнасць па ахоране мацярынства і дзяцінства сведчаць аб тым, якую важную ролю ў жыцці сучаснай Беларусі адыгрываюць духоўнасць, маральныя і эстэтычныя прынцыпы.

Сёлета лаўрэатамі прэміі «За духоўнае адраджэнне» сталі калектывы Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця» і Нацыянальнага мастацкага музея, дзеячы Рускай праваслаўнай і Рымска-каталіцкай цэркваў, аўтары кнігі-рэквіема «Жыць і памятаць». Спецыяльныя прэміі Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва атрымаюць журналісты, вучоныя, мастакі, калектыў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Я асабліва хачу адзначыць дзіцячы ансамбль «Аношкаўскія музыкі», творчасць якога дае нам магчымасць дакрануцца да народнага мастацтва.

Мы ўшаноўваем таксама лаўрэатаў прэміі «Беларускі спартыўны Алімп». Вашы мэтанакіраванасць, воля да перамогі і працавітасць становяцца добрым прыкладам для выхавання чэмпіёнаў, якія праслаўляюць Беларусь.

Дарагія сябры!

Я ўсіх хачу яшчэ раз павіншаваць з добрымі святамі, якія наступілі, — Новым годам, Раством Хрыстовым. Усіх лаўрэатаў я хачу павіншаваць з прысуджэннем гэтых высокіх узнагарод. Я абсалютна ўпэўнены: усенароднае прызнанне, якое вы набылі сёння, стане для вас стымулам да новых дасягненняў на карысць нашай Радзімы.

Я хачу вам пажадаць моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту вам, вашым родным, блізкім, вашым дзецям.

Дзякуй вам».

Фота БЕЛТА.

ЛІЧБА ДНЯ

4 млн кв. м —

агульная плошча жылых дамоў, запланаваных пабудаваць сёлета ў краіне. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 29 снежня 2015 г. №1101. Больш за ўсё жылля мяркуецца ўзвесці ў Мінскай вобласці — 1,1 млн кв. м. Жылыя дамы (кватэры) плануецца пабудаваць для 2194 шматдзетных сем'яў. Што тычыцца арэнднага жылля, то ў 2016 годзе мяркуецца ўзвесці 127,2 тыс. кв. м. Яно будзе пабудавана ва ўсіх абласцях. Выключэнне складзе Мінск, дзе будаўніцтва жылых дамоў (кватэр) для прадастаўлення жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання не прадугледжана. Аб'ёмы фінансавання ў 2016 годзе будаўніцтва (рэканструкцыі) жылля (без уліку затрат на інфраструктуру) складуць Br38 трлн 448,4 млрд.

■ Падаткі

СТУДАТРАДЫ — ПАД ІЛЬГОТУ

А вось за выйгрышы ў казіно сёлета прыйдзецца ўжо заплаціць

З першых дзён года ў краіне пачынае дзейнічаць рэдакцыя Падатковага кодэкса Беларусі са зменамі і дапаўненнямі. Сумесна са спецыялістамі прэс-службы Міністэрства па падатках і зборах рэдакцыя «Звязды» падрыхтавала каментарый па найбольш істотных новаўвядзеннях у ПК, якія з'яўляюцца актуальнымі для большасці чытачоў нашай газеты.

Карт-бланш для мясцовых каштоўных папер

Сапраўды прыемнай навіной для студэнтаў стане дапаўненне ў ПК, згодна з якім вызваляюцца ад падаходнага падатку даходы, атрыманыя за працу ў складзе студэнцкіх атрадаў, што ажыццяўляюць сваю дзейнасць не толькі на тэрыторыі нашай краіны, але і на тэрыторыі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Таксама спрошчаны парадак вызвалення ад падаходнага падатку даходаў, што атрымліваюцца фізічнымі асобамі ад рэалізацыі акцый беларускіх арганізацый. Цяпер выключана ўмова аб тым, што падатковая льгота прымяняецца толькі ў дачыненні да акцый, атрыманых у ходзе першаснага размяшчэння.

Сёлета вызваляюцца ад падаходнага падатку і даходы ад рэалізацыі любых акцый беларускіх арганізацый, у тым ліку атрыманых як у ходзе першаснага размяшчэння, так і набытых на другасным рынку.

У гэтым выпадку патрабуецца выкананне толькі наступных умоў: акцыі, якія рэалізуюцца, павінны належаць фізічнай асобе не менш за тры гады з даты іх набыцця і быць рэалізаванымі асобе, якая не з'яўляецца эмітэнтам гэтых акцый.

Праіндэксавалі дзіцячыя пуцёўкі, матдапамогу і аплату страхавых паслуг

У Падатковым кодэксе новай рэдакцыі павялічаны памеры даходаў, у межах якіх вызваляюцца ад падаходнага падатку пэўныя даходы грамадзян. Сёлета гэта максімальны кошт дзіцячых пуцёвак у санаторна-курортныя і аздараўленчыя арганізацыі краіны да 6,28 млн рублёў (раней было 5,54 млн рублёў). Не абкладаецца падаткам даход у выглядзе матэрыяльнай дапамогі, падарункаў і прызоў, якія атрымлівае супрацоўнік ад арганізацыі па месцы асноўнай работы (службы, вучобы) у памеры да 14,94 млн рублёў (было да 13,19 млн рублёў); ад іншых арганізацый — да 990 тысяч рублёў (было 870 тысяч рублёў).

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Магутны выбух у цэнтры Стамбула

Тэракт адбыўся на цэнтральнай плошчы Стамбула Султанахмет.

Эпіцэнтр выбуху знаходзіўся побач з трамвайным прыпынкам. Установлена, што падарваў сябе тэрарыст-смяротнік. Турэцкім уладам удалося ўстанавіць асобу злачынцы. «Даказана, што выбух здзейсніў тэрарыст-смяротнік з Сірыі 1988 года нараджэння, на месцы здарэння знойдзены фрагменты яго цела», — паведаміў віцэ-прэм'ер Турцыі Нума Куртулмуш на брыфінгу пасля экстраннага пасяджэння па бяспецы ў сувязі з тэрактам у Стамбуле. Reuters, са спасылкай на крыніцы ў кіраўніцтве турэцкіх спецслужбаў, паведаміла, што да выбуху могуць быць датычныя баевікі «Ісламскай дзяржавы». Паводле папярэдніх звестак, у выніку выбуху на цэнтральнай плошчы Стамбула 10 чалавек загінулі, яшчэ 15 атрымалі раненні. Паводле інфармацыі турэцкай газеты Hurriyet, тэрарыст падарваў сябе побач з групай замежных турыстаў. Грамадзян Беларусі сярод пацярпелых ад выбуху на плошчы Султанахмет няма.

Цана барэля нафты Brent упала ніжэй за $32

Кошт ф'ючарса на нафту маркі Brent з пастаўкай у лютым 2016 года на біржы ICE ў Лондане апусціўся больш як на 5 працэнтаў — да $31,94 за барэль, паведамляюць інфармагенцтвы. Такім чынам, кошт нафты Brent апусціўся да ўзроўню, які апошні раз быў зафіксаваны ў красавіку 2004 года. З пачатку года цана Brent упала на 12 працэнтаў. Аналітыкі лічаць, што галоўная прычына спаду цэн — запаволенне эканамічнага росту Кітая. Як паведамлялася, валютныя рэзервы Кітая ў снежні 2015 года прадэманстравалі самае вялікае скарачэнне за ўсю гісторыю.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 16005>

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Германія стала часцей вяртаць бежанцаў у Аўстрыю

Паліцыя Германіі стала часцей вяртаць бежанцаў, якія трапілі ў краіну з Аўстрыі, назад у суседнюю дзяржаву. Пра гэта піша газета Die Welt, спасылаючыся на зводкі аўстрыйскай паліцыі. Калі ў канцы 2015-га ў Аўстрыю штодня вярталі 60 бежанцаў, то з пачатку 2016-га колькасць тых, каго адпраўляюць назад, павялічылася да 200 за дзень. Вартавыя парадку ў ФРГ тлумачаць вяртанне бежанцаў у Аўстрыю захаваннем палажэнняў Дублінскага пагаднення, падпісанага ўсімі краінамі — членамі ЕС. Сутнасць яго асноўнага палажэння заключаецца ў тым, што заява суіскальніка прытулку павінна разглядацца ў той краіне, перасёкшы мяжу якой ён упершыню апынуўся на тэрыторыі ЕС. Многія з тых, каго адсылаюць назад у Аўстрыю, не жадаюць прасіць прытулку ў ФРГ, а хацелі б дабрацца да Даніі ці Швецыі. Большасць з гэтых бежанцаў — не сірыйцы (якія, як правіла, атрымліваюць прытулак), а выхадцы з Афганістана, Марока або Алжыра. На думку журналістаў, рост колькасці бежанцаў, якія вяртаюцца ў Аўстрыю, звязаны з навагоднімі падзеямі ў Кёльне, дзе адбыліся масавыя напады на жанчын, у якіх абвінавачваюць мігрантаў. Гэта здарэнне аказала ціск на канцлера ФРГ Ангелу Меркель, вымусіўшы ўзмацніць жорсткасць яе палітыкі адчыненых дзвярэй для шукальнікаў прытулку.

КАРАТКА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прызначыў генерал-маёра Сяргея Патапенку намеснікам міністра абароны.

Рэестр закладзенай рухомай маёмасці пачне працаваць у Беларусі з 1 верасня. Ён ствараецца ў выглядзе інфармацыйнай інтэрнэт-сістэмы, у якой будзе акумулявацца інфармацыя аб перадачы рухомай маёмасці ў заклад.

Дэпазітныя рахункі на сямейны капітал у ААТ «ААБ Беларусбанк» адкрыты ў сакавіку-снежні 2015 года 11 тыс. 582 грамадзянам Беларусі на $115,82 млн.

Дзяржаўтаінспекцыя наблізіць пасты дарожна-патрульнай службы да школ для забеспячэння бяспекі дарожнага руху дзяцей на маршруце «дом—школа—дом».

Мінск заняў 10-е месца ў рэйтынгу замежных напрамкаў расійскіх турыстаў у навагоднія святы, пры гэтым стаў самым папулярным горадам для паездак у краінах СНД.

■ Круглы стол

КОД ЖЫЦЦЯ

Творчасць паводле закона і закон дзеля творчасці

У гэтым свеце ўсё падлягае сваім законам. Нават у прыродзе вызначаны поры года: мы разумеем, па якіх правілах жыць, калі лета змяняецца восенню, а далей прыходзіць зіма. Людзі таксама вызначаюць правілы — дзеля таго, каб пазбегнуць непатрэбных нечаканасцяў і пралічыць шляхі на будучыню. Яны пішуць законы. Нашы продкі зразумелі каштоўнасць гэтай справы з часоў Вялікага Княства Літоўскага; мы, іх нашчадкі, высока трымаем марку і ўдасканальваем свае законы.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Заканатворчая дзейнасць — таксама творчасць, якая робіцца шляхам думкі, логікі. Як любая творчасць, яна накіравана на тое, каб паляпшаць, упрыгожваць, гарманізаваць жыццё. Асабліва гэта можна сказаць пра заканадаўства ў галіне культуры: праект Кодэкса аб культуры быў вынесены на абмеркаванне грамадскасці летась, але (як сімвалічна!) павінен быць прыняты ў Год культуры, абвешчаны ў Беларусі. Што прынцыпова новага ён адкрые для развіцця сферы? Якія яе кірункі выклікаюць найбольш клопату? Гэтыя пытанні мы абмяркоўвалі з зацікаўленымі асобамі: тымі, хто заканадаўства піша, і тымі, хто будзе потым па ім жыць.

СТАР. 4

■ Віншуем!

Ксёндз Часлаў КУРЭЧКА:

«СЛУЖЫШ ІНШАМУ — ЗНАХОДЗІШ СЯБЕ!»

Сёлета сярод пяці лаўрэатаў прэміі Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне» — настаяцель парафіі Святой Тройцы ў вёсцы Росіца Верхнядзвінскага раёна Часлаў Курэчка. Такім чынам адзначаны яго важкі ўклад у захаванне міжканфесійнага міру і нацыянальнай згоды, актыўны ўдзел у духоўна-асветнай дзейнасці краіны і прапагандзе здаровага ладу жыцця.

Карэспандэнт «Звязды» стаў адным з першых журналістаў, якія павіншавалі паважанага святара.

«НАЙПЕРШ ПРЫХАДЖАНЕ ПАРАДАВАЛІ»

Суразмоўца спачатку размовы ніяк не мог успомніць, якім чынам даведаўся пра высокую ўзнагароду. Хто першы паведаміў: райвыканкам або Віцебская дыяцэзія?.. Потым радасна сказаў, што яго прыхаджане парадавалі. Па тэлевізары яны ўбачылі адпаведны сюжэт.

— Так, гэта была нечаканая навіна. Тэлефануюць і кажуць, што ў эфіры маё прозвішча згадалі. Падумаў: Росіца ж, дзе мо і 200 жыхароў не набярэцца, у самым кутку Віцебскай вобласці, недалёка ад Латвіі. Але такая да яе ўвага ў маёй асобе на прэзідэнцкім узроўні! Бачу ў гэтым Божую волю! Калі ў Росіцы пасля Оршы пачаў служыць, адразу адчуў, што гэта маё! І, доўга не зацягваючы, намеціў сабе: дзе і што трэба прыбраць, як лепш можна будзе добраўпарадкаваць... Вось мы з прыхаджанамі, паломнікамі ўжо 9 гадоў, не складаючы рук, працуем, працуем і працуем. Я пра добраўпарадкаванне і будаўніцтва. І вялікую дапамогу аказвае мясцовая ўлада. Са старшынёй райвыканкама пастаянна кантактуем. Ён прыязджае да нас, я — у райцэнтр. І са святамі адзін аднаго віншуем. І тэхнікай улада дапамагае, і людзьмі. Дарога да нас цяпер добрая, — распавядае ксёндз Часлаў.

Са святаром аўтар гэтых радкоў пазнаёміўся значна раней: у Віцебску пазалетась, у лютым. Ён быў адным з тых, хто па выніках 2013 года атрымаў ганаровае званне «Чалавек года Віцебшчыны». Тады яму ўручалі і прэмію. Штогод вызначаюць каля ста лаўрэатаў. Гэта ідэя экс-старшыні Віцебскага аблвыканкама, цяперашняга кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандра Косінца.

І тады святар сціпла распавядаў, што заслуга не яго аднаго. Ён, у прыватнасці, сказаў: «Напэўна, наверсе — там лепш відаць, хто павінен прымаць узнагароду. Я — звычайны чалавек, святар. Працую з людзьмі, люблю зямлю беларускую і людзей гэтай зямлі. Напэўна, ацанілі маю дзейнасць за тое, што многае зрабіў».

БУДЗЕ СВЯТА... БУСЛОЎ!

Прыгажосць каля касцёла ў Росіцы часта параўноўваюць з тым, што зроблена ў Мосары Глыбоцкага раёна. Ксёндз Ёзас Булька паказаў добры прыклад іншым.

— Мы сябравалі з ім! Я і ў Глыбоцкім раёне служыў... Таксама змагаюся з п'янствам, але не так грунтоўна: забарона на продаж спіртнога ў нашай вёсцы не практыкавалася. Індывідуальна працую з залежнымі. Пераконваю, як магу, малюся. Мне тых, хто не можа жыць без выпіўкі, шкада. Яны слабыя духам. На працу іх запрашаю і на ўрачыстасці розныя. Напрыклад, на Каляды — на салодкі стол... Усе мы сапсаваныя грахом: адны спакушаюцца на гарэлку, другія — на тытунь. У кагосьці іншыя слабасці. Трэба дапамагаць людзям пераадолець іх, — разважае святар.

Ён шчыра рассмяяўся, калі пачуў, што ведаю яго і як любімага кансультанта для кветкаводаў.

— Вы чыталі!? Сур'ёзна? Пра кветкі магу расказаць многае. Спрабаваў аднойчы падлічыць, колькі каля касцёла відаў раслін, дык пасля лічбы 200 пачаў збівацца. Так, магноліі — паўднёвыя прыгажуні ёсць! А чаму б ім не расці, калі даглядаць за імі? Летам абавязкова прыязджайце з сынамі сваімі! Пакажу ўсю кветкавую прыгажосць: німфеі, лілеі, цюльпаны, барбарыс... Да позняй восені нешта цвіце. І калі прыязджаюць паломнікі, многія просяць правесці майстар-клас. Мама вельмі любіла кветкі. На жаль, бацькоў маіх няма ўжо ў жывых. Я сумую па іх. У маёй роднай вёсцы Загоршчына Браслаўскага раёна і сёння жыве брат родны Станіслаў. У яго трое дарослых дзяцей: дзве дзяўчыны і хлопец. Пчаляр ён. Ах, якія прыгожыя мае родныя мясціны! Недалёка касцёл, які з дзяцінства я наведваў, — з цеплынёй распавядае ксёндз.

Ён сціпла прамаўчаў, што яшчэ і прафесійны... кухар! Зайздрошчу знаёмым, якія пакаштавалі яго стравы.

Ксёндз прызнаўся, што нарадзіўся 1 красавіка 1960 года. Як вынік, сказаў, у яго багатая фантазія. Вольнага часу мала, таму ў цёплы час года ўстае, як кажуць, з пеўнямі, а кладзецца спаць позна ноччу. А калі ёсць час, любіць марыць. І прыкладвае ўсе намаганні, каб рэалізаваць задуманае.

На маё пытанне наконт таго, на што патраціць прэміяльныя, спадар Часлаў адказаў, што і на добраўпарадкаванне вёскі таксама. Па яго ініцыятыве з'явіўся штучны вадаём, які вернікі называюць возерам Надзеі. Гавораць, яно выконвае жаданні, калі яны шчырыя. Добраўпарадкавана і яшчэ пара сажалак, спуск да возера...

Сярод розных мерапрыемстваў, якія святар збіраецца ажыццявіць, задумаў арганізаваць... свята буслоў. Ён распавёў падрабязна, як асабіста падрыхтаваў «будаўнічыя матэрыялы», каб птушкі звілі гнёзды. Шкадаваў, што буслоў летась прыляцела меней, чым звычайна.

— Вельмі хачу, каб у касцёле дзейнічаў арган! Было б вельмі добра аднавіць храм у выглядзе, які ён меў у 1911 годзе. Тады яго высокія вежы былі відаць здалёк, нават у Латвіі. Савецкія ўлады распарадзіліся зруйнаваць вежы, каб тыя не сталі цэллю для абстрэльвання з-за мяжы... Трэба зацікавіць патэнцыйных фундатараў, — разважае ксёндз Часлаў.

Насамрэч, было б цудоўна, каб добрыя людзі дапаглі вярнуць былую прыгажосць храму, пабудаванаму 105 гадоў таму!

Святар здзівіў, калі паскардзіўся на недахоп свабоднай зямлі. У адным боку ад касцёла — людзі жывуць, у другім — сельскагаспадарчыя землі... Задумаў ачысціць балота. Хоча сосны высадзіць, валун устанавіць, каб памятную шыльду на ім замацаваць пра падзеі мінулага.

Вядома, што Росіцу ў 1599 годзе купіў канцлер Леў Сапега. Вёска мае слаўную гісторыю. Былі ў яе і «чорныя дні». Тут у лютым 1943 года акупанты правялі карную аперацыю. Знішчылі больш за паўтары тысячы чалавек. Ксяндзы Антоній і Юрый маглі выратавацца, але не пакінулі паству. Яны прынялі разам з вернікамі пакутніцкую смерць. У канцы 1990-х гадоў святароў прызналі святымі пакутнікамі. Памяць пра іх беражліва захоўваюць у вёсцы. Штогод сюды прыязджаюць паломнікі з розных краін. Ёсць у вёсцы мемарыяльны помнік і памятны крыж...

ЖЫЦЦЁ — ГЭТА ЦУД!

Напэўна, цяпер толькі лянівыя не скардзяцца на цяжкае жыццё з-за сусветнага фінансавага крызісу.

— Жыццё цудоўнае! Трэба шанаваць кожную хвілінку, гадзіну і не цкаваць адно аднаго! Дапамагаць трэба адно аднаму і людзей любіць. І дапамагаць ім, як і ўсяму жывому. Дараваць вучыцеся і самім трэба прасіць прабачэння... Гэты год абвешчаны Святым прастолам Годам міласэрнасці. Калі мы служым іншаму, забываючы пра сябе, тады сябе і знаходзім. Набываем суцяшэнне, акрыленае існаванне і радасць, сэнс жыцця... Мне ўжо 55 гадоў, бачыў шмат. Маліцца трэба, дзякаваць Усявышняму за тое, што жывём у такім прыгожым свеце. Цудоўны свет Божы вакол нас. Трэба шчыра радавацца ўсяму гэтаму, — блаславіў чытачоў пасля размовы святар.

Паводле яго слоў, трэба ўсё магчымае зрабіць, каб куточак нашай зямлі быў куточкам раю... І калі кожны з нас унясе ў стварэнне прыгажосці сваю лепту, сам стане прыгожым унутры і звонку.

Мы дамовіліся з лаўрэатам прэміі, што размова наша не апошняя. «Звязда» абавязкова распавядзе пра тое, што яшчэ зробяць у Росіцы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by
Верхнядзвінскі раён — Віцебск.
Фота з асабістага архіва святара

■

СТУДАТРАДЫ — ПАД ІЛЬГОТУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У гэтай катэгорыі падатковых ільгот праіндэксавалі аплату страхавых паслуг, якую за фізічную асобу аплаціла арганізацыя (па месцы асноўнай працы), у тым ліку па дагаворах добраахвотнага страхавання жыцця, дадатковай пенсіі, медыцынскіх расходаў — з 16 млн рублёў да 18,13 млн рублёў на працягу каляндарнага года. Павялічаны памер не абкладанай падаткам бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі, якая атрымліваецца інвалідамі, непаўналетнімі дзецьмі-сіротамі і дзецьмі, што засталіся без апекі бацькоў, — з 87,255 млн рублёў да 98,86 млн рублёў на працягу каляндарнага года. Без падаткаў сёлета атрымліваецца даход ад прафсаюзных арганізацый іх членамі, у тым ліку ў выглядзе матэрыяльнай дапамогі, падарункаў і прызоў, аплаты кошту пуцёвак у памеры да 2,99 млн рублёў (было з 2,635 млн рублёў) на працягу каляндарнага года.

Павялічаны стандартныя вылікі

Таксама ў навай рэдакцыі ПК былі праіндэксаваны памеры стандартных падатковых вылікаў, якія прадастаўляюцца фізічным асобам у адпаведнасці з артыкулам 164 Падатковага кодэкса.

Паводле інфармацыі прэс-цэнтра МПЗ, стандартны падатковы вылік, які прадастаўляецца работніку па месцы асноўнай работы, плануецца павялічыць з 730 тысяч да 830 тысяч рублёў у месяц пры атрыманні даходу, які падлягае падаткаабкладанню, у суме, што не перавышае 5,010 млн рублёў у месяц. Стандартны падатковы вылік на дзяцей да васямнаццаці гадоў і (або) утрыманцаў плануецца павялічыць з 210 тысяч да 240 тысяч рублёў у месяц, а таксама для асобнай катэгорыі грамадзян з 410 тысяч да 460 тысяч рублёў у месяц. А стандартны падатковы вылік, вызначаны падпунктам 1.3 пункта 1 артыкула 164 Падатковага кодэкса, для асобнай катэгорыі грамадзян плануецца павялічыць з 1,030 млн рублёў да 1,170 млн рублёў у месяц.

Маёмасны вылік залежыць толькі ад дагавора

У мэтах забеспячэння роўных умоў атрымання грамадзянамі, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў маёмаснага падатковага выліку на будаўніцтва жылля, з падпункта 1.1 пункта 1 артыкула 166 Падатковага кодэкса выключана норма, якая прадугледжвала магчымасць атрымання асобамі, якія адмовіліся ад унутранага адстройвання пабудаванага з прыцягненнем забудоўшчыка (падрадчыка) жылля, выліку на суму гэтых работ пры самастойным правядзенні такіх работ па заканчэнні будаўніцтва жылля. З 2016 года маёмасны падатковы вылік прадастаўляецца ў межах канчатковага кошту будаўніцтва жылля, прадугледжанага дагаворам з улікам унесеных у яго змен або дапаўненняў.

А падпункт 1.2 пункта 1 артыкула 166 Падатковага кодэкса дапоўнены парадкам пераразліку расходаў, панесеных фізічнымі асобамі ў замежнай валюце на набыццё маёмасці, даходы ад выплатнага адчужэння якога падлягаюць падаткаабкладанню падаходным падаткам. Так, выдаткі, звязаныя з набыццём выплатна адчужальнай маёмасці і (або) яго адчужэннем і зробленыя ў замежнай валюце, падлягаюць пераразліку ў беларускія рублі па афіцыйным курсе беларускага рубля, устаноўленым Нацыянальным банкам Беларусі ў адносінах да адпаведнай замежнай валюты на дату фактычнага атрымання плацельшчыкам даходаў ад адчужэння маёмасці.

З даходаў у казіно — 4%

Менавіта з гэтага года адменена льгота па падаходным падатку ў дачыненні да даходаў у выглядзе выйгрышаў (вернутых незгуляных ставак), атрыманых грамадзянамі ад арганізатараў азартных гульняў (казіно, букмекерскіх кантор, залаў гульнявых аўтаматаў і таталізатараў).

Прызнанне аб'ектам падаткаабкладання падаходным падаткам як выйгрышаў, так і вернутых незгуляных ставак абумоўлена тым, што цяпер адсутнічае тэхнічная магчымасць падзелу і ўліку, а таксама кантролю ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі, які выгляд выплаты — выйгрыш або вернутая незгуляная стаўка, ажыццяўляецца арганізатарам азартных гульняў пры арганізацыі і правядзенні дазволеных ў краіне азартных гульняў. Больш за тое, для дзейнасці па змесце казіно вядзенне такога ўліку немагчыма з прычыны спецыфікі гульняў у карты, цыліндрычнай гульні (рулетка).

Падаткаабкладанне даходаў у выглядзе выйгрышаў (вернутых незгуляных ставак) ажыццяўляецца па стаўцы ў памеры 4% без ужывання вылікаў і льгот па падаходным падатку.

З мэтай устанаўлення адзіных падыходаў з беларускімі грамадзянамі, арганізатары азартных гульняў цяпер вызваляюцца ад абавязку падаваць у падатковыя органы звесткі аб даходах, выплачаных замежным грамадзянам, якія ў далейшым накіроўваюцца ў падатковыя органы адпаведных замежных дзяржаў.

Фота Надзеі БУЖАН.

Цяпер студатрадаўцы вызваляюцца ад падаткаў на ўсіх аб'ектах. На фота: удзельнікі будаўнічага атрада на Беларускай АЭС у Астраўцы.

Калі расходы больш за даходы...

Не ўсе жыхары нашай краіны сёння добраахвотна плацяць падаходны падатак з усіх сваіх даходаў. Аднак парушэнні такія выяўляюцца. Пасля выяўлення падатковым органам перавышэння расходаў над даходамі для такіх «прадпрымальнікаў» пачынае дзейнічаць іншы механізм падаткаабкладання. З 2016 года падпунктам 4.2 пункта 2 артыкула 173 Падатковага кодэкса ўстаноўлена стаўка падаходнага падатку ў памеры 16 працэнтаў у дачыненні да даходаў, палічаных падатковым органам, зыходзячы з сум перавышэння выдаткаў над даходамі ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Даход ад арэнды кватэры лепш падлічыць за год

Калі фізічная асоба здае сваё жыллё ў доўгатэрміновую арэнду, то ўласнік такой нерухомасці плаціць штомесяц фіксаваную стаўку падаходнага падатку. Гэта ў тым выпадку, калі сукупны даход ад такой арэнды не вельмі вялікі. Сёлета ў ПК прапісаны такі максімальны памер гадавога даходу (ён павялічаны з 43,66 млн рублёў да 49,47 млн рублёў), атрыманага ад здачы іншым фізічным асобам жылых і нежылых памяшканняў унаём, пры перавышэнні якога падаткаабкладанне атрыманых даходаў ажыццяўляецца ў агульнапрынятым парадку па стаўцы 13%.

Стаўка на нерухомасць павялічваецца

Вядома, што стаўка падатку на нерухомасць для насельніцтва складае 0,1% ад кошту гэтай маёмасці за год. Адна кватэра ўласніка ў шматкватэрным жылым доме ад аплаты падобнага падатку вызваляецца. На другую і наступныя раней плаціўся пэўны падатак. Цяпер багатых вырашылі крыху «прычасаць». Артыкулам 188 ПК вызначана, што гадавая стаўка падатку на нерухомасць для фізічных асоб, у тым ліку зарэгістраваных у якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, якія маюць ва ўласнасці два і больш жылых памяшканняў у шматкватэрных і (або) у блакіраваных жылых дамах, устаноўлена ў памеры 0,2% ад кошту маёмасці.

Адзіны падатак для індывідуальных прадпрымальнікаў (ІП) і іншых фізічных асоб

Сёлета для ІП-плацельшчыкаў адзінага падатку ўстаноўлены абавязак вядзення першасных уліковых дакументаў па правілах, устаноўленых заканадаўствам для ІП, якія вядуць улік даходаў і расходаў (дапаўненні пункта 5 артыкула 293 Падатковага кодэкса).

Пералік відаў дзейнасці, што абкладаюцца адзіным падаткам, дапоўнены відам дзейнасці «Здача ў арэнду (субарэнду), наём (паднаём) жылых памяшканняў, садовых домікаў, дач, машына-месцаў, акрамя прадастаўлення месцаў для кароткатэрміновага пражывання». Цяпер прадпрымальнікі, якія ажыццяўлялі ў 2015 годзе гэты від дзейнасці (у частцы аказання паслуг спажыўцам), абавязаны сёлета з 1 студзеня спыніць прымяненне іншых рэжымаў падаткаабкладання і перайсці на аплату адзінага падатку.

З мэтай захавання адзіных падыходаў па пытанні вызвалення ад падаходнага падатку даходаў донараў, у тым ліку ў выглядзе захавання сярэдняга заробку пры здачы крыві і яе кампанентаў на бязвыплатнай аснове, у падпункт 1.4 пункта 1 артыкула 163 Падатковага кодэкса ўнесены рэдакцыйныя праўкі.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Стыхія

ЗАВІТАЛА «ДАНІЭЛА» Ў АРАНЖАВЫМ...

Напярэдадні непагадзі намеснік прэм'ер-міністра Анатоль Калінін падпісаў урадавую тэлеграму з даручэннем рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, уладам на месцах забяспечыць кантроль за бяспечнай і надзейнай работай цеплакрыніц, арганізаваць кругласутачнае дзяжурства неабходнай колькасці тэхнікі для расчысткі ад снегу дарог агульнага карыстання, узмацніць аварыйныя і дзяжурна-дыспетчарскія службы і г.д. Пра цыклон з аранжавым узроўнем небяспекі ведалі, мабыць, усе. Але стыхія на тое так і называецца...

«І я па шпалах...»

Учора ранкам некаторым мінчанам давялося часткова дабірацца да працы пехатою: асабісты транспарт, ад якога ў такую непагадзь па рэкамендацыі ДАІ разумна было адмовіцца, і без таго быў прысыпаны гурбамі снегу на стаянках, а грамадскі месцамі трапляў у заторы, таму пасажыры пакідалі яго і шукалі альтэрнатыву аўтобусам, тралейбусам і трамваям. Балазе, што сталічны метрапалітэн падоўжыў ранішні час пік да 10.30. Рухомы састаў без праблем прыняў павялічаны пасажырапаток і дадатковыя нагрузкі. Трэба сказаць, што праблемы з наземным транспартам былі не паўсюдна: калі ў адным раёне горада пасажыры мусілі, як жартавалі ў інтэрнэце, замест ранішняй кавы штурхаць тралейбус, іншыя даехалі да працы, нават асабліва не заўважыўшы наступстваў непагадзі. Хіба толькі дворнікам відавочна можна было паспачуваць, якім прырода ў адзін момант падкінула ў прамым сэнсе слоў адразу столькі снегу, што яны не паспявалі расчышчаць дваровыя тэрыторыі.

Яблыкі ў снезе

На ўборцы снегу на рэспубліканскіх дарогах было задзейнічана 629 адзінак спецыяльнай тэхнікі, для апрацоўкі пакрыцця было зрасходавана каля 9 тысяч тон процігалалёдных матэрыялаў. Па тэхніцы гэта ўдвая, а па матэрыялах — утрая менш, чым спатрэбілася яшчэ суткамі раней. Ранкам у цэнтр аператыўнага кіравання выратавальнікаў з вёскі Гаршкі Мінскага раёна паступіў сігнал, што патрэбна дапамога ў буксіроўцы грузавога аўтамабіля. Высветлілася, што на з'ездзе з другой кальцавой аўтадарогі ў сумёце знаходзіцца грузавік «МАН», які перавозіў садавіну. Работнікі МНС разам з валанцёрамі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа выцягнулі машыну з палону снегу. Паведамлялася, што на раніцу гэта была адзіная інфармацыя аб цяжкасцях перасоўвання аўтатранспарту па дарогах сталічнай вобласці.

Засталіся без святла

Па даных «Белэнерга», ранкам у аўторак былі абясточаны 80 населеных пунктаў. Адключэнні аператыўна выпраўляліся аварыйнымі брыгадамі і ўжо на 6 гадзін раніцы без электрычнасці заставаліся 48 населеных пунктаў у Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай і Мінскай абласцях. Аднак некалькі пазней прыйшла інфармацыя, што з-за складаных умоў надвор'я колькасць населеных пунктаў, дзе адбылося адключэнне электразабеспячэння, павялічылася ў сталічнай вобласці да 100, да іх «далучыліся» 31 малочнатаварная ферма і дзве кацельні. Даных аб пераахаладжэннях не паступала. Аварыйныя брыгады працягвалі аднаўляць падачу электраэнергіі.

Сітуацыя пад кантролем

Дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» учора ў другую змену і сёння зранку павялічыла колькасць рухомага саставу. Разам з тым замест аўтобусаў і тралейбусаў з «гармонікамі» на лініі выходзіць «кароткі» грамадскі наземны транспарт, паколькі яму лягчэй пераадольваць пад'ёмы ў такіх умовах надвор'я. У горадзе пры неабходнасці аказвалі дапамогу і ўсе 18 спецмашын тэхдапамогі прадпрыемства — яны дапамагалі ссунуць з месца транспарт, які захрас.

Беларускі Чырвоны Крыж арганізаваў пункты абагрэву для насельніцтва. Аўтаматары атрымлівалі дапамогу на базе мабільных тэхнічных пунктаў, што перасоўваюцца па буйных магістралях і дарогах. Спецыяльныя мабільныя брыгады гатовыя эвакуіраваць пацярпелых і іх аўтамабілі ў бяспечныя месцы. ДАІ адсочвае дарожную абстаноўку, у выпадку неабходнасці патрэбная інфармацыя перадаецца ў дарожна-камунальныя службы для аператыўнай дадатковай апрацоўкі праезнай часткі процігалалёднымі матэрыяламі.

Была адкрыта ў кругласутачным рэжыме лінія «201», куды ад «101» паступае інфармацыя аб неабходнасці дапамогі з боку валанцёраў Чырвонага Крыжа, якія працуюць разам з супрацоўнікамі МНС.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

А снег не ведаў, падаў...

Больш, чым дзе, снегу выпала ў Мінскай і Віцебскай абласцях. Ранкам у аўторак вышыня снегавога покрыва ў сталіцы складала 22 сантыметры (прырост на 10 сантыметраў з папярэдняй ночы), па поўначы краіны надвор'е дабавіла 10-11 сантыметраў (у Віцебску, напрыклад, вышыня снегавога покрыва складала ранкам 15 сантыметраў).

Паводле звестак дзяжурна-дыспетчарскай службы РУП «Мінскаўтадар-Цэнтр», у 11 гадзін на рэспубліканскіх аўтамабільных дарогах працавала ўжо больш за 1,1 тысячы адзінак снегаўборачнай тэхнікі, у тым ліку 564 песка- і солеразмеркавальнікаў, 455 трактароў, 86 аўтагрэйдараў. У сталічнай вобласці для ўборкі снегу вывелі 320 адзінак тэхнікі, у Брэсцкай — 127, Віцебскай — 272, Магілёўскай — 182, Гомельскай — 82, Гродзенскай — 320. У Мінску дапамагаць гарадскім службам чысціць вуліцы ад снегу ў вольны ад нясення службы дзень выйшлі звыш 200 вайскоўцаў-спецназаўцаў.

Але і сам маху не давай!

Па магчымасці ўстрымайцеся ад паездак на асабістым аўтатранспарце, дае парады Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Машыну лепш паставіць у гараж, а пры яго адсутнасці — паркуйце далей ад дрэў. Навучыце дзяцей, як дзейнічаць падчас непагадзі. Знаходзячыся на вуліцы, абыходзьце хісткія пабудовы і дамы з няўстойлівым дахам. Будзьце асцярожнымі пры знаходжанні на вуліцы, звяртайце ўвагу на захаванасць паветраных ліній электрапередачы. Пры выяўленні любой няштатнай сітуацыі тут жа тэлефануйце па тэлефонах «101» ці «112».

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ВЯЛІКІМ СЕМ'ЯМ — ВЯЛІКІЯ ДАМЫ

У Нараўлянскім раёне ўрачыста адкрыты першы дом сямейнага тыпу. Для ўсёй Гомельшчыны ён стаў саракавым па ліку.

Жыллё дазваляе размясціць 10 дзяцей, але пакуль у яго засяліліся пяць. Бацькі Галіна і Уладзімір Немахавы кажуць, што неўзабаве выхаванцаў стане больш. Галіна ўжо каля 10 гадоў працуе ў якасці прыёмнай маці. Цяпер на такую ж пасаду прыняты і гаспадар.

Між тым напярэдадні Новага года ў Гомелі таксама адкрылі аналагічны дом. У яго засялілася сям'я Любові і Мікалая Драздовых. Сужанцы выхавалі сямёра біялагічных дзяцей, шматдзетная жанчына ўзнагароджана ордэнам Маці, а цяпер Драздовы прыняты на працу ў аддзел адукацыі на пасаду бацькоў-выхавальнікаў. Яны выхоўваюць дзевяць прыёмных дзяцей.

Двухпавярховы будынак быў узведзены за тры апошнія месяцы мінулага года. Сям'я засялілася ў дом, цалкам уладкаваны неабходнай мэбляй, тэхнікай, іншай маёмасцю. Дарэчы, тут у кожнага з дзяцей ёсць уласны пакой. Новы катэдж размешчаны ў мікрараёне Хутар побач з чатырма іншымі дамамі сямейнага тыпу. Такім чынам, у Гомелі ўжо вырасла цэлая дзіцячая вёска.

Будаўніцтва яшчэ чатырох дамоў сямейнага тыпу, якое ажыццяўляецца ў адпаведнасці з прэзідэнцкай праграмай «Дзеці Беларусі», у Гомельскай вобласці запланавана на 2016-2017 гады.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

КОШКА-РАТАВАЛЬНІЦА

У вёсцы Рудня Гарбовіцкая Калінкавіцкага раёна кошка разбудзіла гаспадароў, калі пажар толькі пачынаўся.

Як паведаміў інспектар прапаганды МНС Калінкавіцкага раёна Іван Ётчанка, сям'я Н. нядаўна абзавялася ўласным жыллём — набылі старэнькі дом, у якім збіраліся зрабіць рамонт. Вечарам 4 студзеня сужэнцы леглі спаць, а вось пасярод ночы мужчыну пачала актыўна будзіць кошка Даша. Яна звычайна прасілася на вуліцу раніцай, а тут вельмі настойліва патрабавала ўвагі. Калі гаспадар расплюшчыў вочы, то ўбачыў іскры, якія ішлі пад столлю, адчуў пах дыму, потым пачуў, што лопнуў шыфер. Мужчына тэрмінова разбудзіў дамачадцаў, прыняўся тушыць агонь і выклікаў ратавальнікаў. Яны і дапаглі справіцца з узгараннем. Дарэчы, параілі купіць кошцы смачнага корму ў падарунак — калі б не яна, людзі пацярпелі б. А яшчэ ратавальнікі параілі ўсталяваць у доме аўтаномны пажарны апавяшчальнік. Каб у экстрэмальнай сітуацыі ён дзейнічаў разам з разумнай кошкай.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

АДКУЛЬ ГРОШЫ?

На якія ж «дывідэнды» пры атрыманні нязначных даходаў былі куплены аж дзве кватэры ў Мінску? Пры тым не ў крэдыт! Гэтым пытаннем вельмі зацікавіліся супрацоўнікі падатковай інспекцыі Полаччыны.

— У фізічнай асобы ў сувязі з усталяваннем значнага перавышэння расходаў над даходамі была запатрабавана дэкларацыя. Па выніках праверкі прад'яўлены да выплаты падаходны падатак — 31,7 мільёна рублёў. Грошы пералічаныя ў бюджэт у поўным аб'ёме, — паведамілі «Звяздзе» ў інспекцыі МПЗ па Віцебскай вобласці.

А ў Аршанскім раёне «небагатаму» грамадзяніну прыйшлося заплаціць падаходны падатак — 30,2 мільёна за «тайную любоў» да дарагіх аўто.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*

НІШТО САБЕ РЫБКІ «ХАПНУЛІ»

Два жыхары Жабінкі скралі ў рыбгасе «Сакалова» 554 кілаграмы рыбы. Ды якой — адборных самоў, элітных карпаў, амураў, таўсталобікаў, шчупакоў, карасёў.

— Незаконны ўлоў парушальнікі перавозілі на дзвюх машынах. Першую рэйдавая група Брэсцкай абласной і міжраённай інспекцыі спыніла за паўкіламетра ад зімавальнай сажалкі. У аўтамабілі было пяць мяхоў з рыбай агульнай вагой 275 кілаграмаў, — расказала прэс-сакратар Дзяржінспекцыі Вольга Грамовіч. — Другая машына спынілася сама, калі кіроўца нешта заўважыў. Мужчына выскачыў з аўто і выкінуў на абочыну яшчэ шэсць мяхоў з рыбай. Агулам там было 279 кілаграмаў. Пасля гэтага кіроўца збег у лес.

У хаўрусніцтве з парушальнікамі падазраюцца два работнікі рыбгаса. З'яўляючыся дзяжурнымі, яны, верагодна, прапусцілі машыны на тэрыторыю. Заведзена крымінальная справа, рыба вернута гаспадарцы.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

13 студзеня 2016 г. № 1 (365)

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

«ПУСТЫХ АБЯЦАННЯЎ НЕ ДАЁМ»

Кабінет старшыні Уздзенскага раённага Савета дэпутатаў Ігара ПЯТРОВІЧА адкрыты для наведвальнікаў у любы дзень і час. Да яго прыходзяць са сваімі клопатамі і праблемамі жыхары горада і раёна асабіста або тэлефануюць на мабільнік. Разам з тым Ігар Анатолевіч вядзе два разы на месяц, так бы мовіць, афіцыйныя прыёмы. Акрамя таго, як кіраўнік інфармацыйнай групы, разам са спецыялістамі выязджае непасрэдна ў сельскія Саветы, населеныя пункты, каб не толькі данесці да людзей актуальную інфармацыю, але і выслухаць іх. Плюс да гэтага ў райвыканкаме па суботах з 9 да 12 гадзін праходзіць прамая тэлефонная лінія. Паводле графіка, Ігар Пятровіч таксама дзяжурыць «на провадзе» прыкладна раз на паўтара месяца.

— Кожнае пытанне мы занатоўваем і імкнёмся аператыўна рашаць. Але ёсць звароты, што патрабуюць дадатковага вывучэння, фінансавых затрат. Напрыклад, асфальтаванне дарог, вуліц, капітальны рамонт дамоў. У гэтым выпадку пустых абяцанняў не даём, тлумачым, што праблема будзе вырашацца па меры магчымасці, пры наяўнасці сродкаў, — кажа Ігар Пятровіч. — У прыватнасці, сёлета жыхары вёскі Загоршчына прасілі заасфальтаваць вуліцу. Выехаў на месца, пагутарыў з імі, растлумачыў, што пакуль такое немагчыма. Тым не менш праблему часткова вырашылі: ДАІ паставіла знак, які абмяжоўвае хуткасць аўтатранспарту да 40 кіламетраў у гадзіну. Цяпер тут у летні час стала менш пылу.

У гэтым годзе было шмат зваротаў па нармалізацыі водазабеспячэння, паколькі лета стаяла засушлівае і ўзровень грунтовых вод упаў. З такімі праблемамі сутыкнуліся ў вёсцы Возера. Тут пабудавана шмат новых дамоў, знаходзіцца жывёлагадоўчая ферма. Таму і не хапала магутнасцяў, каб цалкам забяспечыць патрэбы ў вадзе.

— У населеным пункце прабурылі дадатковую свідравіну, спецыялісты жыллёва-камунальнай гаспадаркі ўстанаўліваюць неабходнае абсталяванне, помпы. Мяркую, што ў наступным годзе, калі нават лета будзе гарачым, праблем з падачай вады не ўзнікне, — упэўнены мой суразмоўца. — А вось жыхары райцэнтра на якасць вады скардзіліся. Але і з гэтым пытаннем разабраліся: уведзена ў дзеянне станцыя абезжалезвання, што стала магчымым дзякуючы праграме «Чыстая вада». Даволі часта звяртаюцца людзі з просьбамі зрэзаць старыя аварыйныя дрэвы. Тыя, што знаходзіліся каля аўтатрасы, выдалялі дарожныя службы раёна. У населеных пунктах з праблемай дапамагаюць справіцца сельвыканкамы. Мы тлумачым людзям, што работы лепш перанесці на позняю восень, калі дрэвы скінуць лісце. Тады іх спілоўваць лягчэй і танней.

Што тычыцца работ, якія патрабуюць значных фінансавых выдаткаў — такіх, як асфальтаванне вуліц, падсыпка дарог, уцяпленне і капітальны рамонт дамоў, газіфікацыя населеных пунктаў, — то графік чарговасці іх правядзення надрукаваны ў раённай газеце.

— Мы таксама аказваем інфармацыйную дапамогу тым, хто хоча стварыць кааператыў па газіфікацыі: з чаго пачаць, куды звяртацца. З нашай дапамогай толькі за восень зарэгістравана пяць такіх кааператываў, — кажа Ігар Пятровіч.

Але найбольш складана, як ён прызнаўся, мірыць суседзяў, якія вядуць спрэчкі паміж сабой за зямлю, нібыта няправільна пастаўленую агароджу, дрэвы, што замінаюць. Даводзіцца падключаць спецыялістаў і праваахоўныя органы, каб паміж людзьмі нарэшце наступіла згода.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Часта Неаніле Якаўлеўне дапамагае ўнук — 12-гадовы Аляксей, вучань 6-га класа.

СВАЕ СЯРОД СВАІХ

ПЕРШАЯ Ў ВУЛЬЦЫ

Знаёмцеся: Неаніла Якаўлеўна Місюра — старэйшая вёскі Вулька Першая Лунінецкага раёна, збіральніца і захавальніца сакрэтаў прыроднай аптэкі і проста неабыякавы да жыцця чалавек

Анатоль КЛЯШЧУК

Пра добрыя справы і цікавыя захапленні Неанілы Місюры мне спачатку распавяла дырэктар Вулькаўскага сельскага Дома культуры Вольга Мелюх: «У нас жыве шмат працавітых, душэўных і паважаных людзей, і вясковы старэйшая — адна з такіх», — удакладніла яна і ўпэўнена падкрэсліла: такога старасту наўрад ці дзе яшчэ знойдзеш. Нават імя ў яе незвычайнае, яно паходзіць ад грэчаскага слова і азначае «маладая», «новая».

Тры гады таму Неанілу Якаўлеўну вылучылі на грамадскую пасаду, і колішняя дэпутат сельскага Савета (была ім два скліканні) і загадчыца вясковага дзіцячага сада пагадзілася: як ні як, а чвэрць стагоддзя, праведзеныя на кіруючай пасадзе, далі вялікі вопыт працы з людзьмі, навучылі разбірацца і разумець псіхалогію зносін паміж жыхарамі. Тым больш Неаніла Якаўлеўна нарадзілася і ўвесь час пражыла ў Вульцы Першай, ёй усё тут знаёма, а аднавяскоўцы для яе — нібы родныя, з імі яна заўсёды і ў горы, і ў радасці.

Калі трэба было па-чаць будоўлю капліцы на могілках замест старой, якая згарэла, стараста ўзяла на сябе ўсе клопаты па збіранні грашовых сродкаў, сама прымала ўдзел у будоўлі. Па яе ініцыятыве вяскоўцы паставілі ў пачатку населенага пункта і на выездзе з яго новыя металічныя крыжы. А яшчэ яна падняла пытанне і дамаглася, каб у вёсцы зрабілі яшчэ адзін прыпынак для аўтобусаў. Вёска Вулька Першая не малая, мае працягласць у тры кіламетры.

А яшчэ у Неанілы Якаўлеўны ёсць мара — яна хоча знесці стары незавершаны будынак (ён стаіць тут з часоў развалу СССР). А таксама пабудаваць невялікую краму ў канцы вёскі.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ДУМКІ ЎГОЛАС

ВЯСКОВЫ «ЧАТЫРОХВУГОЛЬНІК»

Пра скарачэнне, аптымізацыю і работу ў адной «звязцы» разважае старшыня раённага Савета дэпутатаў

Столінскі раён — даволі вялікі, а таму па сваіх сацыяльна-эканамічных, дэмаграфічных і іншых характарыстыках разнастайны. Калі ў Альшанах, іншых вёсках давыд-гарадоцкай зоны не хапае зямлі, то ў населеных пунктах столінска-пінскага кірунку, выказваючыся фігуральна, не хапае людзей — там вырашаюць праблемы зносу нічыйных дамоў. У асобных вёсках адкрываюцца новыя дзіцячыя садкі, у іншых — закрываюцца школы і магазіны. Але на ўсіх тэрыторыях мясцовая ўлада вырашае праблемы добраўпарадкавання, сацыяльнага забеспячэння, працуе з насельніцтвам. Аб гэтым і пагаварылі са старшынёй Столінскага раённага Савета дэпутатаў Аляксеем ДЗЯМКО.

— Аляксей Аляксеевіч, што ўяўляюць сабой сёння сельсаветскія кіраўнікі Століншчыны?

— Зазначу адразу, што кіраўнікі 18 сельскіх, аднаго гарадскога, аднаго пасялковага Саветаў дэпутатаў — аўтарытэтныя ў сваіх населеных пунктах людзі з адпаведным узроўнем падрыхтоўкі. Раней, у партыйныя часы, нярэдка было, што ў сельскі Савет «адпраўлялі» чалавека, які не справіўся з кіраўніцтвам калгасам, прасцей кажучы, заваліў работу. Цяпер такое немагчыма. Наадварот, старшынь сельскіх Саветаў часам вылучаюць на больш маштабную і адказную работу. Так і павінна быць. Бо кіраўніцтва мясцовым органам улады становіцца добрай школай гаспадарання. Пры вельмі сціплых сельсаветскіх бюджэтах старшыні трэба ўмець, што называецца, круціцца. Старшыня сельсавета — гэта і гаспадарнік, і ідэолаг у адной асобе. Прыблізна палова нашых сельскіх кіраўнікоў — у мінулым спецыялісты сельскай гаспадаркі, напрыклад, ёсць інжынер-механік, інжынер-будаўнік. Другая палова — жанчыны, большасць з якіх маюць стаж педагагічнай работы. Настойлівасць, цярплівасць, скрупулёзнасць, якія характэрныя для настаўнікаў, вельмі дапамагаюць у рабоце з насельніцтвам, а ёй сельвыканкамы займаюцца пастаянна.

Яшчэ вельмі важна, каб старшыня ўмеў знаходзіць кантакт з кіраўніком мясцовага сельгаспрадпрыемства.

— Вы маеце на ўвазе сумесную работу па вырашэнні пытанняў добраўпарадкавання тэрыторый?

— Гэта — у першую чаргу. Яшчэ гадоў дваццаць пяць таму і дарогамі, і тратуарамі, і рамонтам асобных сацыяльных устаноў займаліся сельгаспрадпрыемствы. Магу так сцвярджаць, бо сам паўтара дзясятка гадоў кіраваў калгасам. Цяпер жа падтрыманне парадку, рамонт і добраўпарадкаванне сталі клопатам сельскай улады. У сельсавета ж, як мы ведаем, не толькі бюджэт абмежаваны, але няма ніякай тэхнікі. Таму і даводзіцца гаварыць пра тое, як важна, каб кіраўнікі працавалі ў адной звязцы, каб было ўзаемаразуменне на карысць агульнай справы. Як можа сёння сельвыканкам знесці нічыйны дом, не прыцягваючы сродкі і тэхніку сельскагаспадарчага прадпрыемства? Ніяк. Гэта нерэальна! А вось там, дзе складаюцца агульныя праграмы па зносе дамоў, ачыстцы і рэкультывацыі ўчасткаў і ўвядзенні новых земляў у севазварот, справа прасоўваецца.

Я шмат гадоў працаваў у сельскай мясцовасці і даўно ўжо вывеў для сябе своеасаблівую схему, дзейснасць якой, на мой погляд, забяспечвае парадак і здаровы мікраклімат у той ці іншай мясцовасці. Названую схему можна накрэсліць у выглядзе чатырохвугольніка, на вуглах якога пазначаны: кіраўнікі сельскага Савета, сельгаспрадпрыемства, дырэктар школы і мясцовы святар. У цэнтры згаданай геаметрычнай фігуры я «малюю» яшчэ ўчастковага інспектара. Калі гэтыя людзі працуюць і дзейнічаюць у адной камандзе, у дадзеным населеным пункце ўсе пытанні вырашаюцца аператыўна і эфектыўна.

— Па цяперашнім часе вы намалявалі амаль ідэальны расклад. Але ж зараз кругом эканомія, усе лічаць грошы, я маю на ўвазе найперш сельскагаспадарчыя прадпрыемствы...

— Не магу не пагадзіцца, што апошнія некалькі гадоў ў эканамічным плане стала больш складана. Кожны літр саляркі на ўліку, бо каштуе нятанна. Таму ўсё цяжэй дапрасіцца дырэктара СВК або ААТ дапамагчы з работай па добраўпарадкаванні. Але разам з тым прадпрыемства многае можа зрабіць для сваіх пенсіянераў. Я не раз казаў кіраўнікам сельгасвытворчасці: «Барані вас Бог дзяліць калгаснікаў на «сваіх» і «чужых» пры апрацоўцы прысядзібных участкаў, дзяльбе сена і іншых момантах». Вясковы працаўнік, які ўступіў у калгас, застаецца калгаснікам пажыццёва, нават калі ён не працуе, а знаходзіцца на заслужаным адпачынку. Асабліва гэта датычыць жывёлаводаў і механізатараў, чыімі рукамі створана цяперашняя база любога СВК. Разумею, што нялёгка, што кожная капейка на ўліку. Але ж заўсёды можна знайсці магчымасць, каб зрабіць па-людску. Таму да ўсялякіх скарачэнняў, рэарганізацый і аптымізацый трэба падыходзіць вельмі ўзважана, каб у пагоні за капеечнай эканоміяй не страціць нешта большае.

> Пры вельмі сціплых сельсаветскіх бюджэтах старшыні трэба ўмець, што называецца, круціцца.

— Гэты тэзіс, відаць, можна прымяніць і ў выпадку са скасаваннем некаторых вясковых аб'ектаў?

— А тут асабліва! На паперы гэта выглядае гладка: закрылі тую ж пошту альбо краму і напісалі справаздачу, што стратных прадпрыемстваў стала менш. А людзям як? У нас, напрыклад, хацелі закрыць пост хуткай дапамогі ў Гарадной. Так, з аднаго боку трымаць яго нерэнтабельна, і на галоўнага ўрача націскаюць зверху. Але мы з дэпутатамі райсавета прааналізавалі сітуацыю з усіх бакоў. У выпадку закрыцця машына хуткай дапамогі не зможа пад'ехаць па выкліку ў кожную з вёсак зоны абслугоўвання за вызначаны сацыяльнымі стандартамі час. Тады ад імя дэпутатаў я выступіў на пасяджэнні райвыканкама, і пытанне пакуль адклалі. Медыцынскія ўстановы — гэта ж аснова сацыяльнай палітыкі на сяле, асабліва ў нас, дзе каля 60 працэнтаў тэрыторыі пацярпела ад чарнобыльскай аварыі. Таму, яшчэ раз скажу, да аптымізацыі неабходна падыходзіць вельмі асцярожна. Так у нас у абсалютнай большасці выпадкаў і робіцца.

Што датычыцца школ, гэта таксама няпростае пытанне. Вядома, няма ніякага сэнсу ўтрымліваць школу, калі ў ёй застаецца дзясятак вучняў. І такія школы мы вымушаны закрываць. Але... У сябе на стале я захоўваю выступленне дырэктара Лядзецкай школы Аксаны Ляшук на свяце вёскі. Аксана Мікалаеўна вельмі пранікнёна, шчымліва, сардэчна гаварыла аб тым, што з закрыццём школы з вёсак паступова сыходзіць жыццё. Гэтае выступленне нярэдка цытую калегам. І думаю, варта яго размножыць і даваць чытаць усім, хто мае дачыненне да прыняцця рашэння аб скасаванні той ці іншай школы. На ўсялякі выпадак...

Нельга падыходзіць агулам і да закрыцця паштовых аддзяленняў, сельскіх крамаў толькі з прычыны іх нерэнтабельнасці. Трэба імкнуцца рабіць іх рэнтабельнымі, калі застаецца для гэтага хоць невялікі рэзерв. І гэта агульная ўстаноўка нашага раённага дэпутацкага корпуса.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

МАСТАЦТВА ПЕРАЎВАСАБЛЕННЯ

Літаральна, як у папулярнай камедыі «Карнавальная ноч», у выканкаме «самі вырасцілі» Бабу Ягу і іншых казачных персанажаў. Падчас навагодняга ранішніка для дзятвы старшыня Лёзненскага сельскага Савета на пэўны час пераўвасобілася ў Бабу Ягу, кіраўнік справамі — у лісічку, а Снягуркай стала супрацоўнік аддзела грамадзянства і міграцыі...

— Мы самі распрацавалі сцэнарый — на аснове знойдзенага ў інтэрнэце. Свята арганізавалі ў будынку выканкама. Паколькі зала там невялікая, прыйшлося паказваць спектакль два разы. Яго, дарэчы, паглядзела каля 60 дзяцей 1—4 класаў, якія жывуць на тэрыторыі сельсавета. На службовых аўто прывезлі тых, хто жыве ў аддаленых вёсках, — распавядае **старшыня сельскага Савета Святлана ПУКАВА.** Яна перажывае, што спектакль не змаглі ўбачыць вучні двух садкоў і дзвюх школ, бо маленькая плошча залы. Але самадзейныя артысты абяцаюць у наступным годзе абавязкова іх парадаваць.

І які Новы год без Дзеда Мароза? Яго ролю выконваў намеснік начальніка РАНС Максім Лашкевіч. А яго калега Алена Дземянкова пераўвасобілася ў кікімару. Разам яны праверылі веданне маленькімі гледачамі правілаў пажарнай бяспекі. (Дзецям нагадалі, што з агнямі, хлапушкамі і запалкамі нельга набліжацца да ёлкі...)

— Падчас прадстаўлення шукалі куфар, вадзілі карагоды, расказвалі вершыкі, разгадвалі загадкі. Дзеці, як кажуць, весяліліся ад душы, і мы таксама, — кажа Святлана.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

Таццяна КАНАНЧУК:

«СТАРАСЦЬ МЯНЕ ДОМА НЕ ЗАСПЕЕ»

Дэпутат парламента — пра стасункі з выбаршчыкамі, працоўную занятасць і ўзаемаадносіны з дзецьмі

Таццяна Кананчук адзіная з «магілёўскіх» дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі працуе адразу з 4 раёнамі — Слаўгарадскім, Быхаўскім, Краснапольскім і Касцюковіцкім. Па колькасці насельніцтва яны не пераўзыходзяць астатнія, але знаходзяцца адзін ад аднаго на значнай адлегласці. Каб усюды паспець, дэпутат садзіцца за руль свайго аўто і метадычна аб'язджае замацаваныя за ёй населеныя пункты. «Мне часам тэлефануюць, пытаюцца: дзе ты? А я ў дарозе, — усміхаецца яна. — Старасць мяне дома не заспее».

«Я толькі крышачку пасадзейнічала...»

У Краснаполле, дзе адбылася наша сустрэча, Таццяна Кананчук завітала якраз напярэдадні Новага года, каб па традыцыі павіншаваць са святам дзяцей і іх бацькоў. Спачатку здавалася, што часу пагутарыць з ёй будзе дастаткова. Насамрэч прыходзілася рабіць гэта ўрыўкамі, паміж сустрэчамі з грамадскасцю і карагодамі вакол ёлак. Дэпутат парламента тут — мясцовая славутасць, кожны імкнецца ёй нешта сказаць, нагадаць пра свае праблемы, даведацца пра справы ў «вярхах»... За кароткі час знаходжання побач з ёй шмат аб чым можна даведацца. Вось, напрыклад, цяпер у Краснаполлі поўным ходам ідзе падрыхтоўка да афіцыйнага адкрыцця раённага гісторыка-этнаграфічнага музея пасля капрамонту. Пакуль працуюць асобныя залы. Таццяна Пятроўна, як высветлілася, прымае актыўны ўдзел у напаўненні іх экспанатамі. Пасля яе перамоў з міністрам лясной гаспадаркі амаль цалкам была афармлена зала прыроды. «Якая тут мая заслуга? Я ж нічога не набывала, толькі крышачку пасадзейнічала, — адмахваецца яна. — Проста напісала ліст. Гэта ж дробязь». Дырэктар музея, праўда, з гэтым не пагаджаецца. Ну якія могуць быць дробязі, калі «слова» народнага абранніка дазволіла атрымаць раённаму музею 50 мільёнаў рублёў на абсталяванне залы?

«Я бачу, што тут ужо шмат школ пабывала», — Таццяна Кананчук гартае кнігу водгукаў і пытаецца ў дырэктара: «Можа, яшчэ чымсьці трэба дапамагчы? Міністр не супраць, думайце, што вам неабходна».

— А яшчэ Таццяна Пятроўна вельмі дапамагла нам у развіцці мясцовых ініцыятыў, — кажа старшыня раённага Савета дэпутатаў Анжэліка Гоман. — Пачынаем займацца самазанятасцю насельніцтва. Праз тыя ж сады і гадавальнікі, якія па асобнай праграме вырошчваюць сёння некалькі нашых шматдзетных сем'яў і Пачапоўская школа. А са студзеня думаем адкрыць цэнтр развіцця сельскіх тэрыторый.

— Наогул гэты праект ахоплівае 3 раёны — Быхаўскі, Слаўгарадскі і Краснапольскі, — удакладняе Таццяна Кананчук. — Паўгода ён праходзіў рэгістрацыі і вось нарэшце ўсё гатова для дзеяння. За кошт сродкаў, якія выдзяляюцца пад гэты праект, будзе ўтрымлівацца памяшканне, закупяць неабходнае абсталяванне — камп'ютары, аргтэхніку. Спецыяліст цэнтра навучыць людзей пісьмова афармляць ініцыятывы, бізнес-праекты, дапаможа знайсці сваё месца ў праектнай дзейнасці. Будуць праводзіцца адукацыйныя трэнінгі з насельніцтвам, азнаямленчыя паездкі, каб паказаць, што і на пашкоджанай Чарнобылем зямлі можна займацца карыснай справай і няблага з гэтага жыць.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

У сям'і Алены і Дзмітрыя Алепкаў.

ПЕРШАЯ Ў ВУЛЬЦЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Прэзідэнт звяртаў увагу на тое, што павінны быць невялікія пункты гандлю ў крокавай даступнасці да жыхароў, бо пенсіянерам ісці ў магазін за 2 кіламетры не так і проста, — сказала старэйшына, калі мы часталіся духмянай гарбатай у яе доме. Гаварылі пра вясковае жыццё, набалелыя праблемы. А яшчэ я з задавальненнем слухаў расповед сваёй суразмоўцы пра яе захапленне народнай медыцынай, разглядаючы калекцыю зёлак.

Якіх толькі лекавых раслін Неаніла Місюра не назбірала мінулым летам і пазалетась! У шкляных слоіках з-пад кавы, у папяровых пакецiках і паркалёвых мяшэчках — амаль уся зялёная аптэка нашых лясоў і лугоў. Больш за пяць гадоў вывучае яна таямніцы прыроды і перадае незвычайныя веды сваім суседзям, знаёмым, сваякам.

— Калі мяне звольнілі з пасады, я спачатку пакрыўдзілася: бо якая ж я пенсіянерка?! Не ведала, куды сябе дзець, чым заняцца і ад гэтага адчувала сябе яшчэ горш. Нарэшце вырашыла сама сябе лячыць, перастала купляць у аптэцы таблеткі і пілюлі, дачка падарыла энцыклапедыю «Лекавыя расліны». Так і з'явілася маё хобі, — усміхаецца вулькаўская траўніца.

Яна навучылася складаць калекцыі зёлкавых збораў з ягад, кветак, лісця, карэнняў, кары дрэў і пупышак, рабіць з іх настоі, адвары і напоі, бальзамы для націрання, спіртавыя настойкі — ад прастуды, для нармалізацыі крывянога ціску і паляпшэння работы сардэчна-сасудзістай сістэмы, для прафілактыкі хвароб печані, нырак і страўніка. А яшчэ Неаніла Якаўлеўна вельмі любіць працаваць у агародзе, садзіць новыя дрэвы і кусты — у садзе, на вуліцы, у полі, каб яны не толькі прыносілі карысць, але і радавалі прыгажосцю...

Фота аўтара.

ВЫПРАБОЎВАЮЦЬ ЛЁД НА ТРЫВАЛАСЦЬ

Часам гэта робіцца цаной здароўя, а то і жыцця

У мінулым годзе ў Брэсцкай вобласці загінулі шэсць чалавек, праваліўшыся пад лёд на вадаёмах. Трое з іх — рыбакі, якія займаліся падлёдным ловам, яшчэ трое — адзін дарослы і двое дзяцей — спрабавалі перайсці вадаём па тонкім лёдзе. Шэсць абарваных жыццяў, шэсць трагедый у сем'ях...

Самае цяжкае, калі ахвярамі становяцца дзеці, якія не вырастуць, і з-за якіх дарослыя будуць усё астатняе жыццё грызці сябе, што не навучылі, не расказалі, не ўнушылі правілы бяспекі. Ну а рыбакі — аматары і шукальнікі экстрыму, якія жыццём заплацілі за ігнараванне правілаў асабістай бяспекі. Нялёгка ўсведамляць, што падобныя здарэнні паўтараюцца з года ў год, нягледзячы на шматлікія папярэджанні і перасцярогі.

Так было і на гэты раз. У першых числах студзеня аблвыканкам прыняў распараджэнне пра забарону выхаду на лёд. Дакументы такога кшталту выходзяць у свет на пачатку сезона і ў канцы, калі лёд асабліва тонкі і небяспечны. Абазначаная мера носіць у значнай ступені прапагандысцкі характар, бо насамрэч ніякіх санкцый да таго, хто лезе на крохкі лёд, няма. Але такім чынам органы мясцовай улады стараюцца прыцягнуць увагу людзей, напомніць ім пра элементарныя правілы бяспекі.

— Забарона — нагода лішні раз аб'явіць па радыё, напісаць у газетах, размясціць адпаведную інфармацыю на стэндзе. Можа, хоць нехта пачытае і задумаецца — гаворыць **старшыня Олтушскага сельскага Савета дэпутатаў Маларыцкага раёна Вітольд ПЯТКЕВІЧ.**

Паводле слоў старшыні, у іх населеным пункце знаходзіцца маляўнічае Олтушскае возера. Як толькі яго паверхня пакрылася тонкім шклом лёду, паявіліся рыбакі. Асноўная іх частка — заўсёднікі з Брэста, якія гадамі прыязджаюць у Олтуш. Большасць рыбаловаў са стажам, як правіла, прытрымліваюцца правілаў бяспекі, маюць выратавальныя сродкі. Але трапляюцца і навічкі, аматары «вясёлага» баўлення часу, пра што сведчаць спецыфічныя шкляныя адходы, якія нярэдка застаюцца побач з месцамі рыбалкі.

Вітольд Мечыслававіч расказаў, што шмат гадоў таму на возеры здарыўся нясшчасны выпадак, калі пацярпелі дзеці, — аб чым да гэтай пары ўспамінаюць у вёсцы. Але тая бяда ўсё ж паслужыла ўрокам для бацькоў, педагогаў, грамадскасці. Найперш вялікая ўвага надаецца выхаванню бяспечных паводзінаў у вучняў. Настаўнікі Олтушскай і Ланской сярэдніх, а таксама Збуражскай школы-садка, сярод якіх ёсць дэпутаты сельскага Савета, заўсёды клапоцяцца аб набыцці адпаведных буклетаў, іншых інфармацыйных матэрыялаў, супрацоўнічаюць з райаддзелам МНС, праводзяць гутаркі і тэматычныя мерапрыемствы... Пра гэта і дзясяты раз нагадаць вучням ці выхаванцам не бывае лішнім, — падсумаваў Вітольд Пяткевіч.

З аматарамі зімовай рыбалкі прафілактычную работу праводзяць супрацоўнікі МНС. Як расказаў **памочнік начальніка Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей МАШНОЎ,** з паніжэннем тэмпературы і пачаткам ледаставу ўсе райаддзелы правялі рэйды на вадаёмах вобласці. Работнікі Брэсцкага гарадскога аддзела па надзвычайных сітуацыях разам з супрацоўнікамі міліцыі і адміністрацыі Ленінскага раёна Брэста прайшлі ўздоўж ракі Мухавец у межах горада. Удзельнікі рэйду сустрэлі нямала рыбакоў. З кожным з іх пагаварылі, пацікавіліся іх веданнем правілаў бяспекі і аказання дапамогі таму, хто праваліўся пад лёд. Таму, што прадэманстраваў прабелы ў ведах, падрабязна расказвалі, як сябе паводзіць на лёдзе і што неабходна браць на рыбалку заўсёды.

Супрацоўнікі Камянецкага райаддзела МНС пайшлі ў рэйд на раку Лясную. Першы намеснік начальніка райаддзела Андрэй Парафянюк тлумачыў аматарам зімовай рыбалкі, якім каварным бывае лёд. Нават калі таўшчыня замерзлай вады дасягае 12 і больш сантыметраў, на сярэдзіне вадаёма нярэдка ўтвараюцца палонкі, якія тояць небяспеку. Калі ж лёд пакрыты снегам, можна іх не заўважыць...

На той жа рацэ Лясной, як толькі паявіўся першы лёд, адбылося надзвычайнае здарэнне. Не з чалавекам. З ласём. Няшчасны звер хацеў ці то перайсці раку, ці то напіцца і праваліўся пад лёд. Хоць глыбіня была не вельмі вялікая — жывёліна стаяла ў вадзе, ды выбрацца з ледзянога палону самастойна ёй было цяжка. Першымі лася заўважылі памежнікі з заставы «Церабунь». Паводле слоў **кіраўніка прэс-службы Брэсцкай памежнай групы Аляксандра КІСЛОВА**, вартавыя мяжы адразу звязаліся з выратавальнікамі і пасля іх прыбыцця разам вызвалілі жывёліну з ледзянога палону. Лось, на шчасце, моцна не пацярпеў. Аказаўшыся на беразе, адразу пабег у лес. Але так здараецца не з усімі жывымі істотамі, якія трапляюць пад лёд. Бо не заўсёды побач аказваецца той, хто прыйдзе на дапамогу. Таму чалавек — як істота разумная — абавязаны заўсёды клапаціцца пра сваю бяспеку.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

«СТАРАСЦЬ МЯНЕ ДОМА НЕ ЗАСПЕЕ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

«Цяпер не сорамна!..»

У Краснаполле Таццяна Кананчук прыехала са шматлікімі пакетамі прысмакаў. Перад гэтым яна 3 дні раздавала падарункі ў іншых «падшэфных» раёнах.

— Гэта ўжо завяршальны этап, — усміхаецца Таццяна Пятроўна. — У Касцюковічах давялося каля ёлкі танцаваць. Віншавалі дзяцей-сірот з усяго раёна, а потым, у гімназіі, — пераможцаў школьных алімпіяд. Пасля з памочніцай, якая ўзначальвае раённую арганізацыю «Белая Русь», завезлі торцікі ў аддзяленне кругласутачнага знаходжання адзінокіх старых людзей. У Слаўгарадзе наведала карэкцыйна-развіваючы цэнтр. У Быхаве, акрамя такога ж цэнтра, яшчэ два дамы сямейнага тыпу... Хочацца, каб святочны настрой панаваў паўсюль. Таму разам са сваімі памочнікамі за асабістыя грошы набываем на «Камунарцы» падарункі і развозім па сем'ях і ўстановах.

У Краснаполлі ў рамках рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці» Таццяна Кананчук наведала некалькі адрасоў. Спачатку прадстаўнічай камандай на чале са старшынёй райвыканкама Ігарам Балахонавым пабывалі ў карэкцыйна-развіваючым цэнтры навучання і рэабілітацыі. Да добрай справы далучыліся старшыня райсавета Анжэліка Гоман, намеснік старшыні райвыканкама па сацыяльных пытаннях Алена Чаюкова, начальнік райаддзела адукацыі спорту і турызму Сяргей Сыранкоў...

Раней краснапольскі карэкцыйна-развіваючы цэнтр дзяліў тэрыторыю з іншымі ўстановамі, а летась цалкам заняў двухпавярховы будынак. Для двух дзясяткаў дзяцей умовы тут сапраўды шыкоўныя. Утульныя залы для гульні і адпачынку, заняткаў фізкультурай і гуртковай працай, шмат цацак і развіваючых гульняў — цэнтр пакідае прыемныя ўражанні, як і яго супрацоўнікі... Таццяну Кананчук між тым цікавіла ўсё: наяўнасць неабходнага абсталявання, укамплектаванасць спецыялістамі... Пачуўшы, што зараз вельмі запатрабаваны дэфектолагі, удакладніла, як хутка бацькі могуць трапіць са сваім дзіцем да спецыяліста на прыём.

У дзіцячым доме сям'і Хлястовых. 4-гадовы Кірыл застаўся задаволены падарункамі.

— Ну, нарэшце і нам ёсць чым пахваліцца, — пракаментавала яна ўбачанае. — Раней жа перад замежнымі гасцямі нават сорамна было! У іх усюды спецыяльныя цэнтры, а мы быццам не бачым гэтых інвалідаў. Для іх павінны быць умовы.

Нялёгкая «роля» бацькоў

...Наша «каманда» рушыць далей, у госці да выхаванцаў двух дзіцячых дамоў сямейнага тыпу — Алепкаў і Хлястовых.

— Для мяне важна асабіста папрысутнічаць у гэтых сем'ях, паглядзець, як яны жывуць, — па дарозе тлумачыць Таццяна Пятроўна. — Ведаю, якая гэта няпростая справа — выхоўваць чужых дзяцей. Дамы сямейнага тыпу ў сваіх раёнах-акругах я наведваю не адзін раз. І вельмі рада, што сувязь паміж выхавальнікамі і дзецьмі не губляецца нават пасля таго, як яны вырастаюць і іх шляхі разыходзяцца

— Цікава, а дзеці пішуць лісты дэпутатам? Можа, нешта просяць?

— Не, — смяецца суразмоўца. — Але раз на год — так было ўсе тры гады майго дэпутацтва — я на вясновых канікулах запрашаю групы з 25 дзяцей ад кожнага раёна на сустрэчу ў Мінск. Разам наведваем Палату прадстаўнікоў, Авальную залу, Музей парламента і яшчэ якую-небудзь цікавую ўстанову. Летась, напрыклад, гэта быў Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, раней — цырк, прадпрыемства «Слодыч», Нацыянальная бібліятэка.

Дзіцячы дом Ігара і Алены Хлястовых працуе ўсяго год, але сужэнцы ўжо прывыклі да ролі выхавальнікаў. Больш за ўсіх радаваўся гасцям малодшы чатырохгадовы Кірыл. Яму не цярпелася як мага хутчэй бегчы разглядаць падарункі. Сям'я чакае чарговае папаўненне: хутка тут з'явіцца яшчэ адно паўтарагадовае прыёмнае дзіця.

У адрозненне ад сваіх калег, Алена і Дзмітрый Алепкі — бацькі з вопытам. Іх дзіцячы дом працуе з 2008 года. Прычым «спецыялізуюцца» яны на выхаванні ўжо больш дарослых 14-15-гадовых падлеткаў. (У такім узросце нават «залатое» дзіця можа аказацца далёка не падарункам.) Пра адносіны прыёмных бацькоў да сваіх выхаванцаў можна меркаваць па генеалагічным дрэве, якое сужэнцы размясцілі на сцяне. Злева — партрэты родных дзяцей, справа — прыёмных. І пра кожнага ёсць што расказаць. Пра дрэннае, вядомая справа, ні слова...

...Ужо на вуліцы, пасля таго, як развіталіся з гасцінымі гаспадарамі, Анжэліка Гоман яшчэ раз з павагай адазвалася пра сям'ю. «Яны сапраўдныя малайцы, дзеці ім трапіліся з характарамі, але ж бацькі спраўляюцца. Алена Алепка, як ніхто іншы, заслугоўвае званне жанчыны года». Таццяна Кананчук з ёй цалкам згодна і паспрабуе падтрымаць гэтую ініцыятыву.

Нэлі ЗІГУЛЯ *zigulya@zviazda.by*
Фота аўтара

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
Аб унясенні дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь»

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 10 снежня 2015 года
Ухвалены Саветам Рэспублікі 18 снежня 2015 года

Артыкул 1. Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 года «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 17, 2/1660; Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 09.01.2015, 2/2227) наступныя дапаўненні:

1. Пункт 1 артыкула 19 дапоўніць падпунктам 1.2^2 наступнага зместу:

«1.2^2. праводзяць рэгіянальныя сходы дэпутатаў Саветаў з удзелам дэпутатаў Саветаў усіх тэрытарыяльных узроўняў, дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ад адпаведных выбарчай акругі і адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, з запрашэннем прадстаўнікоў органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, грамадскіх аб'яднанняў, на якіх заслухоўваюць інфармацыю кіраўнікоў выканаўчых і распарадчых органаў і Саветаў аб сацыяльна-эканамічным развіцці адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак і разглядаюць іншыя пытанні, якія найбольш хвалююць насельніцтва;».

2. У артыкуле 42:

пасля абзаца пятнаццатага дапоўніць артыкул абзацам наступнага зместу:

«уносяць пісьмовыя патрабаванні аб прыцягненні да дысцыплінарнай адказнасці работнікаў ніжэйстаячых выканаўчых і распарадчых органаў і размешчаных на адпаведнай тэрыторыі арганізацый іх наймальнікам;»;

абзацы шаснаццаты—васямнаццаты лічыць адпаведна абзацамі сямнаццатым—дзевятнаццатым.

3. У артыкуле 43:

пасля абзаца пятнаццатага дапоўніць артыкул абзацамі наступнага зместу:

«уносяць у выканкамы абласнога ўзроўню прапановы аб прыцягненні да дысцыплінарнай адказнасці работнікаў размешчаных на адпаведнай тэрыторыі арганізацый, маёмасць якіх не знаходзіцца ў камунальнай уласнасці гэтай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі;

уносяць пісьмовыя патрабаванні аб прыцягненні да дысцыплінарнай адказнасці работнікаў размешчаных на адпаведнай тэрыторыі арганізацый, маёмасць якіх не знаходзіцца ў камунальнай уласнасці гэтай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, і ўносяць адпаведныя прапановы ў выканкам базавага ўзроўню;

уносяць пісьмовыя патрабаванні аб прыцягненні да дысцыплінарнай адказнасці работнікаў размешчаных на адпаведнай тэрыторыі арганізацый, маёмасць якіх знаходзіцца ў камунальнай уласнасці гэтай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі, іх наймальнікам;»;

абзац васямнаццаты лічыць абзацам дваццатым.

5. У артыкуле 45:

пасля абзаца трыццаць дзявятага дапоўніць артыкул абзацамі наступнага зместу:

«разглядаюць пытанні аб неабходнасці прыцягнення да дысцыплінарнай адказнасці работнікаў размешчаных на адпаведнай тэрыторыі непадпарадкаваных арганізацый і ўносяць адпаведныя прапановы ў гарадскі выканкам;

уносяць пісьмовыя патрабаванні аб прыцягненні да дысцыплінарнай адказнасці работнікаў размешчаных на адпаведнай тэрыторыі падпарадкаваных арганізацый іх наймальнікам;»;

абзац саракавы лічыць абзацам сорак другім.

6. Пункт 2 артыкула 48 дапоўніць падпунктам 2.3^1 наступнага зместу:

«2.3^1. уносіць на разгляд выканкама абласнога ўзроўню прапановы аб прыцягненні да дысцыплінарнай адказнасці работнікаў ніжэйстаячых выканаўчых і распарадчых органаў і размешчаных на адпаведнай тэрыторыі арганізацый;».

7. У пункце 2 артыкула 49:

падпункт 2.2 дапоўніць абзацам пятым наступнага зместу:

«кіраўнікоў альбо намеснікаў кіраўнікоў размешчаных на адпаведнай тэрыторыі арганізацый або іх структурных падраздзяленняў, іншых работнікаў гэтых арганізацый (структурных падраздзяленняў), якія ажыццяўляюць арганізацыйна-распарадчыя (кіруючыя, арганізацыйныя, накіравальныя, каардынацыйныя і кантрольныя) функцыі ў дачыненні да арганізацый, іх структурных падраздзяленняў, работнікаў і напрамкаў дзейнасці, у выпадку прызначэння на названыя пасады асоб, звольненых па падставах, якія прызнаюцца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі дыскрэдытуючымі абставінамі звальнення, на працягу пяці гадоў пасля такога звальнення, акрамя пасад, уключаных у кадравыя рэестры кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, абласных і Мінскага гарадскога выканкамаў, раённых выканкамаў, гарадскіх выканкамаў (гарадоў абласнога падпарадкавання), мясцовых адміністрацый раёнаў у гарадах;».

8. Пункт 2 артыкула 50 дапоўніць падпунктам 2.3^1 наступнага зместу:

«2.3^1. уносіць на разгляд мясцовай адміністрацыі прапановы аб прыцягненні да дысцыплінарнай адказнасці работнікаў размешчаных на адпаведнай тэрыторыі падпарадкаваных арганізацый;».

9. У пункце 2 артыкула 52:

падпункт 2.5 дапоўніць абзацам пятым наступнага зместу:

«кіраўнікоў альбо намеснікаў кіраўнікоў размешчаных на адпаведнай тэрыторыі арганізацый або іх структурных падраздзяленняў, іншых работнікаў гэтых арганізацый (структурных падраздзяленняў), якія ажыццяўляюць арганізацыйна-распарадчыя (кіруючыя, арганізацыйныя, накіравальныя, каардынацыйныя і кантрольныя) функцыі ў дачыненні да арганізацый, іх структурных падраздзяленняў, работнікаў і напрамкаў дзейнасці, у выпадку прызначэння на названыя пасады асоб, звольненых па падставах, якія прызнаюцца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі дыскрэдытуючымі абставінамі звальнення, на працягу пяці гадоў пасля такога звальнення, акрамя пасадаў, уключаных у кадравыя рэестры кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, абласных і Мінскага гарадскога выканкамаў, раённых выканкамаў, гарадскіх выканкамаў (гарадоў абласнога падпарадкавання), мясцовых адміністрацый раёнаў у гарадах;»;

дапоўніць пункт падпунктам 2.21^1 наступнага зместу:

«2.21^1. уносіць на разгляд мясцовай адміністрацыі прапановы аб прыцягненні да дысцыплінарнай адказнасці работнікаў размешчаных на адпаведнай тэрыторыі падпарадкаваных арганізацый;».

Артыкул 2. Гэты Закон уступае ў сілу праз дзесяць дзён пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
А. ЛУКАШЭНКА

4 студзеня 2016 года, г. Мінск.
№ 348-3

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 15 февраля 2016 г. торгов по продаже конфискованного имущества

Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение, продаваемого имущества)	ПРЕДМЕТ ТОРГОВ № 1	ПРЕДМЕТ ТОРГОВ № 2
	- капитальное строение с инвентарным номером 614/С-25044, площадью 229,4 кв.м (наименование: садовый домик; назначение: садовый домик), расположенное по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, садоводческое товарищество «Орешники»; - земельный участок с кадастровым номером 624883000020000062, площадью 0,0640 га (назначение: земельный участок для коллективного садоводства), расположенный по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, садоводческое товарищество «Орешники» (капитальное строение (садовый домик) площадью 229,4 кв.м расположен на земельном участке площадью 0,0640 га)	- земельный участок с кадастровым номером 624883000020000063, площадью 0,0488 га (назначение: земельный участок для коллективного садоводства), расположенный по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, садоводческое товарищество «Орешники»
Начальная цена	320 724 700 белорусских рублей	1 718 700 белорусских рублей
Сумма задатка	32 072 400 белорусских рублей	171 800 белорусских рублей
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-40-22	

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится 15 февраля 2016 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 18.01.2016 по 10.02.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.941. Нумар падпісаны ў 19.30 12 студзеня 2016 года.

Информационное сообщение о проведении аукциона
по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Смолевичи

1	Форма проведения аукциона	Открытый
2	Дата, время и место проведения аукциона	г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 16.02.2016 г в 14.00
3	Продавец и его адрес	г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком
4	Земельный участок, его кадастровый номер и адрес	Лот №1 – площадь 0,1500 га, кадастровый номер 624850100008000007, г. Смолевичи, ул. И. Шамякина, 7 Лот № 2 – площадь 0,1500 га, кадастровый номер 624850100008000187, г. Смолевичи, Е. Полоцкой, д. 33
5	Условия продажи	Без изменения целевого назначения
6	Целевое назначение земельного участка	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома
7	Начальная стартовая цена	Лот № 1 – 130 000 000 рублей Лот № 2 – 130 000 000 рублей
8	Условия аукциона	А) продажа по цене не ниже начальной; Б) участниками аукциона могут быть граждане Республике Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь; В) наличие не менее двух участников
9	Наличие инженерной инфраструктуры	Лот № 1 – гравийная дорога Лот № 2 – гравийная дорога
10	Условия оплаты	За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней со дня подписания протокола по результатам проведения аукциона
11	Сумма задатка и реквизиты продавца	10% от начальной стартовой ценны на р/с 3641000000205 ЦБУ 621 филиала № 616 АСБ «Беларусбанк», г. Жодино, код 812 УНП 600014139, ОКПУ 04064735, назначение платежа 04002. (с пометкой «задаток за земельный участок»)
12	Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком	Каждый четверг с 9.00 до 13.00
13	Окончательный срок приема заявлений	10.02.2016 г. – 17.00

Затраты на организацию и проведение аукциона; (лот № 1 – 540 000 рублей и лот № 2 – 540 000 рублей) и публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Подлесная, д. 11, каб. № 14.

Окончательный срок приема заявлений – 10.02.2016 г. 17.00.

Контактный телефон (8-01776) 5-52-65.

Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

- заявление на участие в аукционе по установленной форме;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков);
- физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

ОБЪЯВЛЕНИЕ
О ПРОДАЖЕ АКЦИЙ

Вошкат Анатолий Сергеевич, объявляет о продаже акций ЗАО «Солигорский завод технологического оборудования» в количестве 160 простых акций (2,0793% Уставного фонда общества) по цене не ниже 184 долларов США за акцию по курсу Национального банка на день покупки.

Вошкат Дмитрий Анатольевич, объявляет о продаже акций ЗАО «Солигорский завод технологического оборудования» в количестве 1015 простых акций (13,1904% Уставного фонда общества) по цене не ниже 184 долларов США за акцию по курсу Национального банка на день покупки.

Чирко Юлия Анатольевна, объявляет о продаже акций ЗАО «Солигорский завод технологического оборудования» в количестве 775 простых акций (10,0715% Уставного фонда общества) по цене не ниже 184 долларов США за акцию по курсу Национального банка на день покупки.

Лущицкая Татьяна Анатольевна, объявляет о продаже акций ЗАО «Солигорский завод технологического оборудования» в количестве 775 простых акций (10,0715% Уставного фонда общества) по цене не ниже 184 долларов США за акцию по курсу Национального банка на день покупки.

Срок размещения акций в продаже – 30 календарных дней со дня объявления о продаже.

По вопросу приобретения акций обращаться по адресу: Минская обл., г. Солигорск, а/я 16, т.м. +37544 796 37 31.

В связи с поступившим **в суд Ляховичского района** заявлением об объявлении умершим МАШЕЯ Евгения Ивановича, 05 сентября 1963 года рождения, уроженца д. Свирка Швенгенского района Республики Литва, последнее известное место жительства – г. Ляховичи Брестской области, ул. Чкалова, д. 9, кв. 3, просьба ко всем гражданам, что-либо знающим о местонахождении данного гражданина, сообщить об этом в течение двух месяцев со дня публикации в суд Ляховичского района, расположенный в г. Ляховичи Брестской области по ул. Первомайской, д. 6.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ
Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62.

Продавец: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей», 210002, г. Витебск, ул. М. Горького, 62, (029)896-47-55, (029) 714-50-17, alex-68.06@mail.ru.

Лот №1. Рапирный ткацкий станок фирмы «Dornier» мод. PTS 8/J с накатным устройством NEUENHAUSER, 2012 г. в., инв. №145064, зав. №51853. **Начальная цена: 1 421 730 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 142 173 000 бел. руб. Шаг аукциона – 71 087 000 бел. руб.**

Лот №2. Рапирный ткацкий станок фирмы «Dornier» мод. PTS 8/J с накатным устройством NEUENHAUSER, 2012 г. в., инв. №145063, зав. №51852. **Начальная цена: 1 421 730 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 142 173 000 бел. руб. Шаг аукциона – 71 087 000 бел. руб.**

Лот №3. Рапирный ткацкий станок фирмы «Dornier» мод. PTS 8/J с накатным устройством NEUENHAUSER, 2012 г. в., инв. №145072, зав. №51854. **Начальная цена: 1 447 290 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 144 729 000 бел. руб. Шаг аукциона – 72 365 000 бел. руб.**

Лот №4. Грузовой бортовой GAZ 3307, рег. знак 9901 ВТО, 1993 г. в., цвет голубой. **Начальная цена: 22 860 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 2 286 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 143 000 бел. руб.**

Лот №5. Гидроподъемник ХТЗ Т-16, 1993 г. в., инв. №161036. **Начальная цена: 33 480 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 3 348 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 674 000 бел. руб.**

Лот №6. Оборудование навесное снегоочистителя фрезерно-роторного ОФР-200, 2011 г. в., инв. №145035. **Начальная цена: 80 748 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 8 075 000 бел. руб. Шаг аукциона – 4 038 000 бел. руб.**

Лот №7. Прицеп 2 ПТС-4, рег. знак БХ 6680, 1998 г. в. **Начальная цена: 12 060 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 206 000 бел. руб. Шаг аукциона – 603 000 бел. руб.**

Лот №8. Трактор МТЗ-82.1, рег. знак БЯ 4304, 1992 г. в. **Начальная цена: 44 370 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 4 437 000 бел. руб. Шаг аукциона – 2 219 000 бел. руб.**

Лот №9. Экскаватор ЭО-2621В, рег. знак БЯ 4305, 1992 г. в. **Начальная цена: 58 770 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 5 877 000 бел. руб. Шаг аукциона – 2 939 000 бел. руб.**

Лот №10. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, 1992 г. в., инв. №144637. **Начальная цена: 17 820 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 782 000 бел. руб. Шаг аукциона – 891 000 бел. руб.**

Лот №11. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, 1984 г. в., инв. №143668. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №12. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, 1985 г. в., инв. №143886. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №13. Станок сверлильный (2М112), 1993 г. в., инв. №144739. **Начальная цена: 8 307 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 830 700 бел. руб. Шаг аукциона – 416 000 бел. руб.**

Лот №14. Станок горизонтально-фрезерный 6Т80Ш, инв. №141180, 1947 г. в. **Начальная цена: 35 577 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 3 557 700 бел. руб. Шаг аукциона – 1 779 000 бел. руб.**

Лот №15. Станок горизонтально-фрезерный 2М82, инв. №141202, 1966 г. в. **Начальная цена: 18 864 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 886 400 бел. руб. Шаг аукциона – 944 000 бел. руб.**

Лот №16. Станок горизонтально-фрезерный 6Р81, инв. №143649, 1984 г. в. **Начальная цена: 15 237 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 523 700 бел. руб. Шаг аукциона – 762 000 бел. руб.**

Лот №17. Станок горизонтально-фрезерный 6Т80Ш, инв. №144699, 1993 г. в. **Начальная цена: 41 553 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 4 155 300 бел. руб. Шаг аукциона – 2 078 000 бел. руб.**

Лот №18. Станок токарно-винторезный 16Д20, инв. №144698, 1993 г. в. **Начальная цена: 24 795 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 2 479 500 бел. руб. Шаг аукциона – 1 240 000 бел. руб.**

Лот №19. Станок токарно-винторезный 16Д20, инв. №141217, 1966 г. в. **Начальная цена: 21 429 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 2 142 900 бел. руб. Шаг аукциона – 1 072 000 бел. руб.**

Лот №20. Машина сновальная, инв. №14301, 1967 г. в. **Начальная цена: 48 600 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 4 860 000 бел. руб. Шаг аукциона – 2 430 000 бел. руб.**

Лот №21. Машина сновальная инв. №143961, 1986 г. в. **Начальная цена: 40 500 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 4 050 000 бел. руб. Шаг аукциона – 2 025 000 бел. руб.**

Лот №22. Машина красильно-роликовая, инв. №144815, 1994 г. в. **Начальная цена: 16 920 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 682 000 бел. руб. Шаг аукциона – 846 000 бел. руб.**

Лот №23. Резервуар алюминиевый емкостью 1,5 м³ (ГСМ), инв. №18571, 1971 г. в. **Начальная цена: 11 880 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 188 000 бел. руб. Шаг аукциона – 594 000 бел. руб.**

Лот №24. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143696, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №25. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143697, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №26. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143698, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №27. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143699, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб..**

Лот №28. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143700, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №29. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143660, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №30. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143661, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №31. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143663, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №32. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143662, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №33. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143620, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №34. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143619, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №35. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143636, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №36. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143635, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №37. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143665, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №38. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143625, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №39. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143643, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №40. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143645, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №41. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143616, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №42. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143931, 1985 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №43. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143854, 1985 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №44. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143852, 1985 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №45. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143890, 1985 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №46. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143722, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №47. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143883, 1985 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №48. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143872, 1985 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №49. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143727, 1984 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Лот №50. Станок ткацкий СТБ-2-180-КН, инв. №143875, 1985 г. в. **Начальная цена: 11 268 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 126 800 бел. руб. Шаг аукциона – 564 000 бел. руб.**

Повторные торги состоятся **29.01.2016 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: **с 13.01.2016 с 8.30 по 28.01.2016 до 17.30.** Задаток перечисляется на р/с 3012411521014 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской обл., МФО 739, УНН 300082525. Получатель платежа: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Объекты находятся по адресу: г. Витебск, ул. М.Горького, 62. Извещения о проведении аукционов опубликованы в газете «Звязда» 21.11.2015, 25.11.2015.

Продавец: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей», 210002, г. Витебск, ул. М.Горького, 62, (029)896-47-55, (029) 714-50-17, alex-68.06@mail.ru.

Лот №1. Линия по производству геотекстильных материалов: Линия пропитки фирмы «Ontec», инв. №145052, 2012 г.в.э., Ткацкая машина фирмы «Dornier» (Дорнье), инв. №145050, 2012 г.в.э., Шпулярник фирмы «Texmer» инв. №145053, 2012 г.в.э. **Начальная цена: 5 346 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 534 600 000 бел. руб. Шаг аукциона – 267 300 000 бел. руб.**

Лот №2. Грузовой фургон тентовый МАЗ 5336 А5-321, рег. знак АВ 8019-2, 2009 г.в., цвет белый. **Начальная цена: 126 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 12 600 000 бел. руб. Шаг аукциона – 6 300 000 бел. руб.**

Лот №3. Прицеп тентовый МАЗ 837810-014, рег. знак 2449 АА-2, 2009 г.в., цвет светло-серый. **Начальная цена: 44 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 4 400 000 бел. руб. Шаг аукциона – 2 200 000 бел. руб.**

Торги состоятся **15.02.2016 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: **с 13.01.2016 с 8.30 по 12.02.2016 до 16.30.** Задаток перечисляется на р/с 3012411521014 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Витебской обл., МФО 739, УНН 300082525. Получатель платежа: ОАО «Витебский комбинат шелковых тканей». Объекты находятся по адресу: г. Витебск, ул. М.Горького, 62.

Продавец: ОАО «Кожевник», 212003, г. Могилев, ул. Челюскинцев, 137, (222) 31-42-83.

Лот №1. Изолированное помещение с инв. №700/D-113703, площадью 211,6 кв.м, по адресу Могилевская обл., г. Могилев, ул. Челюскинцев, 137/1-1, наименование: изолированное помещение, назначение: производственное помещение; Капитальное строение с инв. №700/С-48917, площадью 572 кв.м, по адресу Могилевская обл., г. Могилев, ул. Челюскинцев, 137, наименование: Шерстомойный цех, назначение: Здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий; МБП, компьютерная техника в количестве 49 наименований (согласно перечню). Имущество расположено на зем. участке с кадастровым №740100000003001290 (23/40 доли в праве аренды). Начальная цена: 955 886 667 бел. руб. без НДС. Задаток: 95 589 000 бел. руб. Шаг аукциона – 47 795 000 бел. руб.

Лот №2. Капитальное строение с инв. № 700/С-97496, площадью 51,3 кв.м, по адресу: г. Могилев, ул. Заводская, 74 (назначение – здание специализированное трубопроводного транспорта, наименование – станция береговая насосная); МБП - 17 наименований. Имущество расположено на зем. участке с кадастровым № 740100000003006866. Начальная цена: 129 496 600 бел. руб. без НДС. Задаток: 12 950 000 бел. руб. Шаг аукциона – 6 475 000 бел. руб.

Лот №3. Гидравлическая двоильная машина Rizzi SR6/3000 (инв. №119). Начальная цена: 540 144 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 54 014 400 бел. руб. Сумма шага аукциона – 27 008 000 бел. руб.

Лот №4. Молот пневматический МВ-412 (инв. №1319). Начальная цена: 12 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 200 000 бел. руб. Шаг аукциона – 600 000 бел. руб.

Лот №5. Станок токарно-винторезный 163 (инв. №847). Начальная цена: 14 643 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 464 300 бел. руб. Шаг аукциона – 733 000 бел. руб.

Лот №6. Станок заточной 3 А64 (инв. №1556). Начальная цена: 2 853 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 285 300 бел. руб. Шаг аукциона – 143 000 бел. руб.

Лот №7. Станок поперечно-строгальный (инвентарный №846). Начальная цена: 3 159 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 315 900 бел. руб. Шаг аукциона – 158 000 бел. руб.

Лот №8. Станок фрезерный горизонтально-консольный (инвентарный №836). Начальная цена: 17 037 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 1 703 700 бел. руб. Шаг аукциона – 852 000 бел. руб.

Лот №9. ЗИЛ 5301 грузовой платформа тентовая, рег. знак АА 7135-6, цвет серо-голубой. Начальная цена: 32 400 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 3 240 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 620 000 бел. руб.

Лот №10. MAZ 53366 грузовой платформа, рег. знак ТМ9856, цвет серый, 1997 г.в. Начальная цена: 53 190 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 5 319 000 бел. руб. Шаг аукциона – 2 660 000 бел. руб.

Лот №11. Погрузчик экскаватор Карпатец, ном. знак 0647, серия МЖ, 1990 г.в. Начальная цена: 29 430 000 бел. руб. без НДС. Задаток: 2 943 000 бел. руб. Шаг аукциона – 1 472 000 бел. руб.

